# БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!



№ 24
СЬНЕЖАНЬ
1929 г.

# XI год БССР

*Да ўсіх членаў КП(б)Б, рабочых, працоўных сялян і чырвонаармейцаў.*

(З адозвы ЦК КП(б)Б).

**11 год рабочая кляса ў саюзе з бядняцка-серадняцкім сялянствам Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б будуе сацыялізм.**

Таварышы!

Адзінаццаць год як рабочыя і бядняцка-серадняцкае сялянства Беларусі, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, скінулі ўладу нямецкіх акупантаў, паноў, капіталістых і іх дапаможнікаў—эсэраў, меншавікоў, бундаўцаў, беларускіх незалежнікаў і іншых наймітаў капіталістых і заснавалі Савецкую Сацыялістычную Беларусь.

VI абласная канфэрэнцыя РКП(б), якая адбылася 27—31 сьнежня 1918 году абвясьціла сябе першым зьездам КП(б)Б і разам абвясьціла незалежнасьць БССР. Утварэньне БССР было магчымым дзякуючы вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая разьбіла ланцугі сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня і ажыцьцёвіла праграмны лёзунг Камуністычнай партыі—права нацый на самавызначэньне і самастойнае дзяржаўнае існаваньне.

Адзінаццаць год таму назад Беларусь, вызваленая Чырвонай арміяй з-пад ярма нямецкай імпэрыялістычнай акупацыі, з-пад улады прадаўшай сябе нямецкаму імпэрыялізму згодніцкай Беларускай Рады, прыступіла да сацыялістычнага эканамічнага і культурнага будаўніцтва БССР.

Савецкая Беларусь у выніку гаспадараньня на яе абшарах зграі імпэрыялістых атрымала цяжкую спадчыну,—разбураныя прадпрыемствы, зруйнаваную частымі падпаламі і грабежніцтвамі сельскую гаспадарку. У гэтых цяжкіх умовах і пачалося сацыялістычнае будаўніцтва гаспадаркі і культуры маладой пралетарскай дзяржавы.

Толькі ленінскае кіраўніцтва Камуністычнай партыі, рэвалюцыйная цьвёрдасьць рабочых і працоўных сялян усіх нацыянальнасьцяй і цесны саюз Савецкай Сацыялістычнай Беларусі з іншымі нацыянальнасьцямі Савецкага Саюзу вывелі БССР на шырокі шлях шпаркіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Толькі ў складзе Савецкага Саюзу, дзякуючы вялізарнай дапамозе СССР, змагла Беларусь зьнішчыць разбуранасьць сваёй гаспадаркі і няроўнапраўнасьць нацыянальнасьцяй, пайсьці па шляху шпаркага аднаўленьня, па шляху сацыялістычнай рэканструкцыі.

За гэтыя адзінаццаць год на тэрыторыі Беларусі вырасьлі нябачныя ніколі раней моцныя гіганты прамысловасьці, нябачнымі ў гісторыі тэмпамі ідзе сацыялістычная рэканструкцыя народнай гаспадаркі, у тым ліку сацыялістычная перабудова гаспадаркі бядняцка-серадняцкага сялянства,—разгарнулася суцэльная калектывізацыя раёнаў і акруг, ідзе росквіт беларускай пралетарскай культуры і культуры нацыянальных меншасьцяй. Натхнёныя цьвёрдаю верою ў перамогу сацыялізму і творчым энтузіязмам, працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б з перавышэньнем выканалі першы год пяцігодкі і ставяць перад сабою рэальную пэрспэктыву выкананьня пяцігодкі ў скарочаны тэрмін і калектывізацыю Беларусі.

Расьце і мацнее Савецкая Сацыялістычная Беларусь у вялікай сям'і Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Толькі КП(б)Б зьяўляецца арганізатарам БССР, а яе першы зьезд заснавальнікам БССР. Буйныя і непераможныя посьпехі БССР на фронце сацыялістычнага будаўніцтва сталі магчымымі дзякуючы сталёваму адзінству Камуністычнай партыі і яе правільнаму ленінскаму кіраўніцтву.

Шпаркі тэмп сацыялістычнага будаўніцтва і рашучае выкарчоўваньне капіталістычных элемэнтаў вызначаюць шалёнае супраціўленьне клясавага ворага. Толькі ў гэтай сувязі тлумачыцца актывізацыя варожых пралетарыяту сіл і ў тым ліку шавінізмаў розных нацыянальнасьцяй. У гэтай сувязі і актывізаваўся беларускі нацыянал-дэмакратызм—палітычны выразьнік беларускай буржуазіі і дапаможнік сусьветнага фашызму.

Актывізацыі клясавага ворага працоўныя супрацьстаўляюць энэргічны пад'ём энтузіязму на будаўніцтва сацыялізму, рабочыя актыўна дапамагаюць калектывізаваць вёску, сацыялістычнае спаборніцтва ахапляе ўсё большыя і большыя колы працоўных.

У мэтах далейшага рашучага прасоўваньня наперад па шляху сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі, цьвёрда кіруючыся генэральнай лініяй партыі, мы павінны і надалей бязьлітасна змагацца з усялякімі скажэньнямі лініі партыі на аснове шырокага разгортваньня самакрытыкі. Бязьлітасная барацьба з правай небясьпекай, як галоўнай, і прымірэнцтвам да яе, барацьба з „левымі“ загібамі і бязьлітасная барацьба з нацыянал-апартунізмам і нацыянал-дэмакратызмам зьяўляецца і надалей нашай першачарговай задачай.

Міжнародны капітал яшчэ і сёньня рыхтуе свае сілы, каб сарваць мірную працу працоўных СССР, рыхтуе новы ўзброены паход супроць СССР, жорстка распраўляецца з рэвалюцыйным рухам у сябе дома. Тут на мяжы з капіталістычным захадам мы бачым, як польскі імпэрыялізм разам з беларускім нацыянал-фашызмам, выконваючы пляны сусьветнага імпэрыялізму, распраўляецца з працоўнымі Заходняй Беларусі, распраўляецца з лепшымі прадстаўнікамі працоўных. На збройныя падрыхтаваньні імпэрыялістых працоўныя БССР адкажуць узмоцненым тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва, усямерным узьняцьцем абараназдольнасьці краіны, рашучым наступленьнем на капіталістычныя элемэнты.

---

Няхай жыве Кастрычнікавая рэвалюцыя, якая разьбіла ланцугі нацыянальнага прыгнечаньня!

Няхай жыве адзінаццацігодзьдзе БССР і арганізатар БССР—КП(б)Б!

Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве Чырвоная Армія—верны вартавы межаў БССР і СССР!

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

**ЦК КП(б)Б.**

3ок-1
1844

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 24. ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦК КП(б)Б. Сьнежань, 1929 г.

А. Арцюхіна.

# Гістарычны пленум.

Пленум ЦК ВКП(б) адбыўся ў час падвядзеньня вынікаў першага году пяцігодкі.

Гэты пераломны год зьяўляецца годам вялікіх дасягненьняў на ўсіх франтах сацыялістычнага будаўніцтва, перамогі партыі і рабочае клясы ва ўсіх рашаючых вучастках дасягнуты ва ўмовах вялізарнага абвастрэньня клясавай барацьбы ў горадзе і вёсцы і пры абвостранай барацьбе з правымі апартуністымі ў партыі.

Мы дабіліся вялізарнага працоўнага ўздыму шырокіх мас рабочае клясы. Сацыялістычнае спаборніцтва дало вялізарны рост вытворчасьці працы і ўзьняла працоўную дысцыпліну.

Мы дабіліся такога накапленьня сродкаў, што можам укладваць у капітальнае будаўніцтва 3 мільярды 400 мільёнаў рублёў. У гэтым годзе мы меркавалі ўлажыць толькі 2 мільярды 800 мільёнаў руб.

Мы ўтварылі найвялікшы пералом у сельскай гаспадарцы. Маем шырокі рух у калектывы і камуны ня толькі беднаты, але і шырокіх мас серадлякоў.

На пленуме ўстаноўлена, што прадукцыя буйнай сацыялістычнай прамысловасьці за першы год пяцігодкі ўзрасла на 23,7 проц. Па пляну яна павінна была вырасьці толькі на 21,4 проц. Прадукцыя галін прамысловасьці, выпрацоўваючых сродкі вытворчасьці (машыны), узрасла на 29,8 проц. Па пляну яна павінна была ўзрасьці на 25,6 проц.

Шпаркасьць разьвіцьця нашай прамысловасьці зусім нябачаная. Напрыклад, зараз мы маем на Урале 20 чыгунна-ліцейных заводаў, у іх 30 дамяных пячэй. Працуе 100 тысяч рабочых. Яны вырабляюць 1 мільён 100 тысяч тон чыгуну ў год.

А навейшы, які зараз будуецца, Магнеснагорскі завод будзе мець чатыры дамяных печы. Будуць працаваць 10 тысяч рабочых і будуць вырабляць таксама 1 мільён 100 тысяч тон чыгуну.

Прымаючы кантрольныя лічбы па прамысловасьці, пленум ЦК асабліва спыніўся на прадстаячых цяжкасьцях.

Пленум ЦК, падкрэсьліваючы бязумоўную абавязковасьць зьніжэньня сабекаштоўнасьці прамысловай прадукцыі на 11 проц., лічыць гэта заданьне аднэй з важнейшых і асноўных дырэктыў усяго пляну гаспадарчага разьвіцьця на 1929/30 год, прычым адначасова з зьніжэньнем сабекаштоўнасьці абавязкова павінна паляпшацца якасьць прадукцыі.

Пленум ЦК асабліва падкрэсьлівае важнасьць задачы забесьпячэньня росту рэальнай заработнай платы ў 1929/30 годзе ня менш як на 12 проц.

Вялізарныя сродкі мы ўкладваем і ў сельскую гаспадарку. У 1930 годзе гэтыя ўкладаньні складаюць 4 мільярды 600 мільёнаў р., а па пляну меркавалася патраціць 3 мільярды 500 мільёнаў р. Дзяржава разгорне вялізарнае будаўніцтва сельска-гаспадарчых машын. Зараз будуюцца 2, выключныя па велічыне, трактарных заводы—адзін—у Чалябінску, і другі—у Харкаве. Яны будуць выпускаць па 40 тысяч трактараў у год. Будуюцца 2 нябачаных заводы камбайнаў. Яны будуць выпускаць па 25 тысяч машын-камбайнаў. Адзін завод будуецца ў Растове-на-Дану, а другі—ў Новасібірску.

Такіх вялікіх заводаў па будоўлі камбайнаў няма нідзе ў Эўропе. У Амэрыцы маецца толькі адзін завод, які выпускае 25 тысяч камбайнаў у год.

Гэта будаўніцтва новых заводаў дае нам вялізарнае павялічэньне трактароў, якія мы пусьцім на палі СССР. Мы ўжо ў гэтым годзе маем 60 тысяч трактароў. У 1930 годзе мы будзем мець 100 тысяч трактароў, а ў 31/32 г.—каля 250 тысяч трактароў.

Ленін казаў: „Калі-б мы маглі мець заўтра 100 тысяч першаклясных трактароў, здаволіць іх бэнзінам, здаволіць іх машыністымі (вы добра ведаеце, што пакуль гэта—фантазія), то сярэдні селянін сказаў-бы „за камуню“ (гэта ёсьць за камунізм)“.

Зараз гэта заўтра надыходзіць. У 1930 годзе ў нас будзе 100 тысяч трактароў. Мы маем вялікія дасягненьні ў справе разьвіцьця саўгасаў і калгасаў.

Пасеўная плошча ў саўгасах узрасла за першы год пяцігодкі з 1 мільёна 425 тысяч гэктараў у 1928 годзе, да 1 мільёна 816 тысяч гэктараў у 1929 годзе. Таварная прадукцыя саўгасаў у 1929 годзе складала 8 мільёнаў цэнтнэраў (каля 47 мільёнаў пудоў). У 1930 годзе пасеўная плошча саўгасаў будзе складаць 3 мільёны 280 тысяч гэктараў. Таварная-ж прадукцыя каля 13 мільёнаў цэнтнэраў (110 мільёнаў пудоў).

Яшчэ больш бурна растуць калгасы. Пасеўная плошча калгасаў за першы год пяцігодкі вырасла ў тры разы. У 1928 г. пад калгасамі было занята 1 мільён 390 тысяч гэктараў, а ў 1929 г.—4 мільёны 262 тысячы гэктараў.

За гэты год пасеўная плошча калгасаў зноў павялічыцца ў тры разы і будзе складаць 15 мільёнаў гэктараў.

Таварнага хлеба калгасы ў 1930 г. дадуць у 15 раз больш, як яны давалі ў 1928 г., ці каля 40 мільёнаў цэнтнэраў (г. ё. каля 300 мільёнаў пудоў).

У надыходзячым 1930 г. таварная прадукцыя хлеба ў саўгасах і калгасах будзе складаць каля 70 мільёнаў цэнтнэраў (400 мільёнаў пудоў). А гэта значыць, што яны дадуць дзяржаве палову ўсяго патрэбнага хлеба для здавальненьня гарадоў, арміі і гэтак далей. А па пляну мы меркавалі толькі ў 1933 г. ад калгасаў і саўгасаў атрымаць менш паловы патрэбнага хлеба

ГПБ Ср. Аз.

Мы жывем у момант вялізарнай цягі сялянскіх мас у калгасы, у тым ліку і сераднякоў. Мы ледзь пасьпяваем упраўляцца з разгарнуўшымся ростам калгасаў. У 1928 г. было 33 тысячы калгасаў, у іх 1 мільён 900 тысяч чалавек, у 1929 г.—60 тысяч калгасаў, у іх 4 мільёны 700 тысяч сябраў. У 1930 г. будзе 100 тысяч калгасаў, у іх—15 мільёнаў чалавек.

Мы ўжо зараз маем раёны і акругі суцэльнай калектывізацыі. Кожны новы дзень прыносіць новыя калгасы. На Паўночным Каўказе было намечана калектывізаваць 8 проц. у 1929 г., а фактычна калек-



Мэталюргічны завод імя Дзяржынскага, Тульская г.

тывізавана 25—30 проц. Такі шпаркі рост калектывізацыі мы маем у Ніжня-Волскім краі, на Украіне і ў Сярэднім Паваложжы. Практыка калектывізацыі абганяе ўсе нашы пляны. Вёска ў масе сваёй, уключаючы і серадняка, вайшла ў паласу сацыялістычнай перабудовы.

Праца па калектывізацыі зараз кіпіць, як мора. Улетку ў 1930 г., будзе ў асноўным скончана калектывізацыя Паўночнага Каўказу. Усе асноўныя сельска-гаспадарчыя раёны, відаць, скончаць калектывізацыю к 1931 г.

Вясна надыходзячага 1930 г. будзе рашаючай. Рыхтавацца к гэтаму трэба безадкладна, сёньня-ж бо часу няма.

Дапамога рабочых і работніц у вёсцы зараз, у пэрыяд масавай калектывізацыі, будзе мець рашаючае значэньне.

На працягу зімы мы павінны рыхтавацца да таго, каб увясну гэтага году перамагчы ў час пасяўной кампаніі.

Кожная работніца, актыў батрачак, бядначак і сераднячак павінны ведаць, якая вялікая адказнасьць у справе калектывізацыі вёскі. Растлумачыць адсталай сялянцы перавагу калектыўнае гаспадаркі—справа нялёгкая. Кулаччо, якое праціставіць нашай рабоце сваю агітацыю, часьцяком сустракае спачуваючых сярод адсталых сялянак. У шэрагу раёнаў, пры шалёным супраціўленьні нашаму сацыялістычнаму наступленьню, кулакі і папы апіраюцца на адсталых сялянак. Яны іх скарыстоўваюць для сваіх мэт. Справа работніц і вясковага жаночага актыву—безадкладна павесьці работу так, каб канчаткова выбіць грунт з-пад ног кулака. Гэта можна зрабіць шляхам растлумачэньня сялянкам задач калектывізацыі, шляхам паказальнай работы лепшых калгасаў.

Для гэтага трэба, каб калгасы, якія арганізуюцца, больш клапаціліся аб арганізацыі працы калгасьніц, аб павышэньні іх культурнага ўзроўню, аб палепшаньні быту. Найбольш клапот павінна быць аб дзецях. Работніцы павінна дапамагчы арганізаваць працу ў калгасах, паставіць культурную і бытавую работу ў іх.

Трэба заўсёды памятаць, што кулак ёсьць наш зьлейшы вораг, які ў любую хвіліну можа нанесьці нам удар, дзе-кольвек кулакі ўжо пралезьлі ў калгасы. Дзякуючы кулакам ёсьць выпадак зрыву хлебанарыхтовак у калгасах. Пагэтаму вялізарную ролю ў справе калектывізацыі будзе адыгрываць арганізацыя беднаты ў калгасах. Трэба замацаваць моцныя групы беднаты, наладзіць сходы беднаты, паставіць работу па падняцьцю культурнага ўзроўню беднаты. Неабходна стварыць кіруючыя кадры з беднаты і батракоў для работы ў калгасах.

Саўгасы таксама павінны дапамагчы ў справе арганізацыі і замацаваньня калгасаў. Кожны рабочы і работніца фабрык і заводаў, саўгасаў—павінны памятаць сваю кіруючую ролю ў справе калектывізацыі.

Пленум ЦК пастанавіў мабілізаваць 25 тысяч рабочых на арганізацыю калгасаў. Каля 5 тысяч работніц паедуць у вёску у дапамогу сялянкам. Будзе павялічана пасылка рабочых брыгад у вёскі для дапамогі калектывізацыі. Брыгады работніц пры ўдзеле настаўніц і ўрачэй будуць дапамагаць арганізацыі быту і культуры ў калгасах. Асобныя фабрыкі і заводы будуць шэфстваваць над асобнымі калгасамі. Чырвоная армія, гарадзкія саветы—усе арганізацыі павінны прыйсьці на дапамогу вёсцы, асабліва раёнам суцэльнай калектывізацыі.

Вялізарныя задачы, якія стаяць зараз перад намі з асобай вастратой, высоўваюць пытаньне аб кадрах. Патрэбны спэцыялісты, патрэбны кіраўнікі саўгасаў і калгасаў, з рабочых, батракоў і беднаты.

Старым спэцыялістым поўнасьцю давяраць нельга, сярод іх ёсьць шкоднікі. Толькі ў гэтым годзе выкрыта 24 шкодніцтва. Дзякуючы шкодніцтву шэраг заводаў быў выведзен канчаткова з строю. Які выхад для нас з гэтага становішча? Гатовіць узмоцненым тэмпам з рабочых і работніц, батракоў і беднякоў,



Люберэцкі завод с.-г. машын.

спэцыялістых і кіраўнікоў. Нам патрэбна тэрмінова рыхтаваць гэтых спэцыялістых яшчэ і таму, што кадры, якія зараз маюцца, недастатковы для новых фабрык і заводаў.

**Патрэбна тэрмінова заняцца вучобай рабочых і работніц, батракоў і батрачак, беднякоў і бядначак—для падрыхтоўкі іх у вышэйшыя навучальныя ўстановы, усюды арганізаваць падрых-**

**тоўчыя курсы і рабфакі для гэтай мэты.** Трэба большы лік дзяцей рабочых, вясковай беднаты і батрацтва з школ 2-й ступені пасылаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Патрэбна павялічыць вылучэньне рабочых і работніц, батракоў і батрачак на работу па кіраўніцтву прадпрыемствамі: саўгасамі і калгасамі. Наладзіць іх вучобу для таго, каб яны былі сапраўднымі кіраўнікамі. Абавязак кожнага вылучэнца і вылучэнкі ўнікаць у справу, не спадзяваючыся толькі на спэцыяліста, а самому вырашаць пытаньні па сутнасьці. Неаслабна павышаць сваю пісьменнасьць, пільнасьць да акаляючых.

На гэтым пленуме выступалі з заявай правыя— Рыкаў, Бухарын, Томскі. Правая апазыцыя прызнае нашы дасягненьні і ў галіне разьвіцьця прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, асабліва ў галіне калектывізацыі, але, з другога боку, яны лічаць, што калі-б партыя пашла за імі, то атрымаліся-б тыя-ж вынікі, але з меншымі ахвярамі. Для пленуму ЦК такое прызнаньне апазыцыяй нашых дасягненьняў— недастаткова, бо ўсе дасягненьні партыі атрыманы у барацьбе з апазыцыяй і супроць яе. Мала зараз прызнаць нашы дасягненьні, іх бачыць і сьляпы. Трэба чэсна адмовіцца ад сваіх памылковых поглядаў, сказаць, што партыя была права.

Апазыцыя-ж праракала нам у 1929 г. голад, яна казала, што прыдзецца рэзаць вытворчыя праграмы, яна была супроць такой шпаркай індустрыялізацыі, супроць такога высокага размаху ў будаўніцтве саўгасаў і калгасаў. Яна казала, што калгасы і саўгасы дадуць хлеб толькі праз 5—10 год. Яна прапанавала ўвезьці хлеб з-за мяжы і многае іншае.

А што атрымалася на справе? Мы ўжо зараз амаль скончылі хлебанарыхтоўкі. Мы маем запасы недатычнага хлеба ў некалькі дзесяткаў мільёнаў пудоў. Мы маем моцны рух беднаты і сераднякоў у калгасы, мы маем вялізарны ўздым рабочае клясы. Мы першы год пяцігодкі выканалі з посьпехам.

Пленум ЦК прапанаваў апазыцыі прызнаць свае памылкі. Але яна на самым пленуме не згадзілася. Таму пленум ЦК вывеў галоўнага правадыра апазыцыі тав. Бухарына з складу Палітбюро ЦК, а т. т. Рыкава, Томскага і Угарава—папярэдзіў. Папярэджаньне пленуму ўзьдзейнічала на таварышоў і



У чаканьні „удка работніцы ліквідуюць няпісьменнасьць.

яны апублікавалі заяву ад 26 лістапада 1929 году, у якой яны прызналі свае памылкі і правільнасьць лініі партыі.

Лістападаўскі пленум ЦК мае выключнае гістарычнае значэньне. З яго рашэньнямі павінны азнаёміцца кожная работніца, батрачка і актыў сялянак.



Вязальны цэх Віцебскай панчошнай ф-кі.

# Пяцідзесяцігодзьдзе тав. Сталіна.

**Правадыра Усе КП(б), бліжэйшага саратніка Леніна ў дзень пяцідзесяцігодзьдзя вітаюць рабочыя ўсяго сьвету. Мільённыя масы пралетараў могуць быць упэўнены ў тым, што Цэнтральны Камітэт Бальшавіцкай Партыі, які мае ў сваіх радох такога кіраўніка як тав. Сталіна, давядзе краіну да поўнай пабудовы сацыялізму і перамогі пралетарскай рэвалюцыі ўва ўсім сьвеце.**

## Генэральны штаб бальшавікоў—сваму кіраўніку.

### ЦК і ЦКК УсеКП(б)—тав. СТАЛІНУ [1]).

**ДАРАГІ ПРЫЯЦЕЛЬ І БАЯВЫ ТАВАРЫШ!**

Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Кантрольная Камісія Ленінскае партыі горача вітаюць цябе—лепшага ленінца, старэйшага члена Цэнтральнага Камітэта і яго Палітбюро.



50 год жыцьця, 30 з лішкаю год тваё актыўнае бальшавіцкае дзейнасьці непарыўна зьвязаны з усёю гэраічнаю барацьбою нашае партыі і з перамогамі ленінізму. Ад першых дзён твае працы, як прафэсыйнага рэвалюцыянэра, які будаваў пад кіраўніцтвам т. Леніна першыя ячэйкі бальшавіцкае арганізацыі, ты выказаў сябе як верны, лепшы вучань тав. Леніна. З непасрэдных вучняў і таварышоў па барацьбе тав. Леніна ты зьявіўся самым цьвёрдым і пасьлядоўным да канца ленінцам. Ні разу на працягу ўсяе твае дзейнасьці ты не адступаў ад Леніна як у сваіх тэарытычных і прынцыповых пазыцыях, так і ва ўсёй практычнай працы. У пераможныя дні вялікага Кастрычніка ты ў процілегласьць іншым вучням Леніна зьявіўся першым, самым лепшым і самым верным яго памочнікам, як вядомы арганізатар кастрычніцкіх перамог.

У цяжкія дні, калі вырашаўся лёс рэвалюцыі, ты разам з тав. Леніным цьвёрда абараняў бальшавіцкую стратэгію супроць тых апартуністых, хто расколваў партыю, падрываючы бальшавіцкае адзінства.

У гады грамадзянскае вайны партыя пасылала цябе для арганізацыі перамог на самых рашаючых франтох. Тваё імя зьвязана з самымі слаўнымі перамогамі нашае Чырвонае арміі.

Ужо ў першай схватцы з ворагамі ленінізму пасьля сьмерці тав. Леніна, Цэнтральны Камітэт у барацьбе за ленінскае адзінства партыі згуртаваўся навакол цябе, як самага вернага і вытрыманага прадаўжальніка справы т. Леніна. Партыя атрымала бліскучую перамогу над трацкізмам і над Зіноўеўска-Каменеўскай апазыцыяй, якая фальшыва прыкрывалася сьцягам ленінізму, а на справе зьяўлялася простаю агентураю контр-рэвалюцыйнага трацкізму.

З тваім імем непарыўна зьвязаны нябачаныя ў гісторыі грамадзтва тэмпы індустрыялізацыі краю і рашучага пераводу вёскі на рэйкі калектыўнае і буйнае сацыялістычнае гаспадаркі, сьмелая атака на кулака, разгортваньне сац. спаборніцтва і самакрытыкі.

Сёньнешні дзень яшчэ цясьней згуртуе мільённую партыю навакол Цэнтральнага Камітэту, згуртуе шматмільённыя масы пралетарыяту і працоўных навакол ленінскае генэральнае лініі партыі, за якую ты вёў барацьбу, вядзеш барацьбу і якой ты аддаеш усе свае сілы, энэргію і веды.

Няхай жыве Ленінская бальшавіцкая партыя!

Няхай жыве жалезны салдат рэвалюцыі—тав. Сталін!

Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Кантрольная Камісія Усесаюзнае Камуністычнае партыі (бальшавікоў).

[1]) Друкуецца ў скарочаным выглядзе.

---

**Няхай жыве Ленінская Бальшавіцкая Партыя.**

**Няхай жыве сталёвы правадыр рэвалюцыйнага пралетарыяту—тав. Сталін.**

# СВАЯЧАСОВА ПАДРЫХТУЕМСЯ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎКАМПАНІІ

Мы ўступілі ў новы этап карэннай сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

У гэтай сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі выключна важнае палітычнае і эканамічнае значэньне набывае надыходзячая сельска-гаспадарчая пасяўная кампанія.

**Пасеўкампанія гэтага году павінна даць вялікі зрух як у справе калектывізацыі** вёскі, так і ў падняцьці вытворчасьці сельскай гаспадаркі.

Надыходзячая сельска-гаспадарчая кампанія павінна даць значнае ўзбуйненьне старых калгасаў і арганізацыю новых соцень буйных калгасаў.

Калгасны рух высокім тэмпам разгарнуўся ў сельска-гаспадарчую кампанію мінулага году і набыў масавы характар. Арганізаваны буйныя калгасы на плошчы 25 тысяч гэктараў, аб'яднаючыя цэлыя сельсаветы, а зараз мы перайшлі да суцэльнай калектывізацыі раёнаў і акруг, мы ахапілі 17% усёй с.-г. плошчы калгасамі.

Усе гэтыя посьпехі па калектывізацыі мы мелі ў выніку правільнага правядзеньня лініі партыі, у выніку ўздыму актыўнасьці рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, у выніку рашучай барацьбы з шалёным супраціўленьнем кулацка-капіталістычных элемэнтаў. Бядняцка-серадняцкія масы сялянства далі рашучы адпор гэтым спробам кулака перашкодзіць росту калектывізацыі і пашырэньню пасяўной плошчы.

Вопыт мінулых сельска-гаспадарчых кампаній, а таксама і вопыт кампаніі перавыбараў дэлегацкіх сходаў паказаў, што кулак, выкінуты з усіх пазыцый, імкнуўся ў сваёй агіднай рабоце знайсьці апору сярод больш адсталых груп працоўных мас сялянкі. Кулакі выкарыстоўвалі для гэтай мэты сходы жанчын, выступаючы з агіднай хлусьнёй на калгасы, спрабуючы зрываць сходы, калі іх палітыка правальвалася.

Бывалі выпадкі, калі кулакам удавалася зьбіць з правільнага шляху працоўных жанчын, калі сялянкі, падбухтораваемы кулакамі, ішлі супроць калгасаў, і арганізацыя калгасу зрывалася. Такія выпадкі былі ў шэрагу месц. Так напрыклад: у вёсцы Навасёлкі Койданаўскага раёну жанчыны не жадалі ўступаць у калгас, і нават батрачкі і бядначкі выступалі і гаварылі: „лепш вы нас на вяроўцы павесьце, чым у калгас весьці". У Мсьціслаўскім раёне пры правядзеньні зямляўпарадкаваньня калгасу, калі прыехалі каморнікі абмерваць лентай мяжу, 32 сялянкі селі на ленту і не давалі працаваць, а за іх сьпіной стаялі: былы абшарнік, нейкі быўшы прысяжны паверaны і яшчэ пара кулакоў.

Але-ж трэба адзначыць, што **маса бядначак і серадначак у цэлым усьвядоміла асноўныя нашы задачы па карэннай сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі і сьвядома пашла ў нагу з усёй бядняцка-серадняцкай масай сялянству пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе авангарда камуністычнай партыі ў рашучае наступленьне на кулака і яго спробы сарваць нашы мерапрыемствы.**

**Вясновая сельска-гаспадарчая кампанія, якая будзе таксама праходзіць пры ўмовах імкненьня кулацтва сарваць посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуе мабілізацыі актыўнасьці рабочае клясы, батрацтва і ўсяе бядняцка-серадняцкае масы сялянства вакол выкананьня намечаных задач**

Мы павінны памятаць, што многа трэба прарабіць. Вызначаныя пляны вельмі напружаныя.

Трэба да часу вясеньняга севу абагуліць 35 проц. яравога кліну БССР у калгасы, а да канца севу ўдзельная вага калгасаў у агульнай плошчы павінна быць даведзена да 50 проц.

Ураджайнасьць у калгасах павінна быць узьнята згодна плянаў на 25 проц., у саўгасах на—30 проц., а ў сялянскіх гаспадарак—на 20 проц.

Колькасьць буйнай рагатай жывёлы павінна быць павялічана на 10 проц. і сьвіней на 30 проц. у параўнаньні з мінулым годам.

На ажыцьцяўленьне гэтых плянаў трэба мабілізаваць самадзейнасьць усяе працоўнай масы сялянства. Актыўнасьць жаночых бядняцка-серадняцкіх мас павінна быць таксама накіравана на вырашэньне гэтых задач.

**Асаблівая роля прыпадае ў гэтай вялікай рабоце на батрачак, бядначак і серадначак калгасьніц. Яны першыя павінны дапамагчы партыі і ўладзе выканаць гэтыя вялікія задачы.**

**Калгасьніца, батрачка, бядначка і серадначка павінны прасачыць, каб усё, намечанае па пляну, выканана было ў першую чаргу ў тэй гаспадарцы, дзе яна жыве і працуе і роўным сябрам якое яна з'яўляецца.**

Сваёй актыўнасьцю калгасьніца павінна паказаць, што справа ператварэньня калгасаў у сапраўдныя сацыялістычныя гаспадаркі—гэта яе справа.

Абагуленьне вытворчых сродкаў у калгасах (машын, жывёлы, будоўлі), складаньне абагуленых насенных фондаў, набыцьцё за абагуленыя сродкі новых машын і жывёлы, гатунковага насеньня і штучнага ўгнаеньня, падняцьце дысцыпліны і вытворчасьці працы ў калгасе—усе гэтыя пытаньні, зьвязаныя з падрыхтоўкай да сяўбы, не павінны прайсьці міма калгасьніцы.

**На калгасьніц ускладаецца абавязак дапамагчы ў разгортваньні масавай калектывацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак тым, што яна будзе растлумачваць бядначцы і серадначцы неабходнасьць ісьці ў калектыў, будзе працістаўляць агітацыі кулака сваё правільнае тлумачэньне аб калектывізацыі.**

**Дэлегацкія сходы на вёсцы як у калгасах, так і ўне калгасу павінны стаць тэй школай, якая выкуе актыўных змагароў за вырашэньне тых задач, якія намечаны да сельска-гаспадарчай кампаніі.**

**КРЭМЕР.**

# Перадавых работніц—на будаўніцтва калгасаў.

Зараз па ўсяму Савецкаму Саюзу хутка растуць калгасы. Усьлед за бедняком у калгасы пашла і серадняцкая маса вёскі. Цэлыя сельсаветы, раёны і нават акругі аб'ядноўваюцца ў калгасы. Магілеўская акруга будзе ўжо на працягу гэтага году цалкам калектывізавана.

Гэтыя значныя посьпехі калгаснага руху зьяўляюцца вынікам правільнага праводзеньня лініі партыі, забясьпечыўшай моцны ўзрост прамысловасьці і ўзмацненьне змычкі рабочай клясы з аснаўнымі масамі сялянства.

Адначасова гэты буйны рост калгасаў ставіць перад партыяй і рабочай клясай шэраг новых складаных задач.

Аднымі з цяжкасьцяй калгаснага будаўніцтва зьяўляюцца: нізкі тэхнічны ўзровень калгасаў, недастатковая вытворчасьць і арганізаванасьць працы ў калгасах, асабліва жаночай, недахоп спэцыялістых і падрыхтаваных кіраўнікоў калгасаў.

Вялікі рост калгаснага руху адбываецца ўва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы; у шэрагу з прамой барацьбой супроць калектывізацыі кулакі спрабуюць пралезьці ў калгасы, каб разлагаць іх знутры.

Пагэтаму важнейшай задачай у сучасны момант зьяўляецца згуртаваньне батрацка-бядняцкага ядра ў калгасах, усямернае ўзмацненьне кіруючага ўплыву рабочых у калгасным руху.

Пленум Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) параўшыў для ўзмацненьня кіруючых кадраў калгасаў пасылаць для работы на вёску 25 тысяч рабочых. У Беларусі для работы ў калгасы паедзе 500 рабочых і работніц.

Зараз з шэрагу прадпрыемстваў паступае шмат заяў ад рабочых-дабраахвотнікаў, якія хочуць ехаць для работы ў калгасы, каб перанесьці вопыт арганізаваных рабочых гораду на вёску ў калгас.

*Перадавая сьвядомая работніца павінна быць у першых радох дабраахвотнікаў.*

Яна павінна дапамагчы арганізаваць актыў калгасьніц для работы па ўцягненьню ў калгасы бядняцка-серадняцкіх мас сялянак вёскі, якіх імкнецца, як больш адсталых, скарыстаць кулак для зрыву калектывізацыі.

Работніца павінна дапамагчы больш правільна арганізаваць працу калгасьніц, каб узьняць яе вытворчасьць, а таксама і паставіць тыя галіны гаспадаркі калгасу, дзе больш ужываецца праца жанчыны: жывёлагадоўля, гародніцтва, птушніцтва, перапрацоўка малочных прадуктаў і інш. Трэба дабіцца больша шага ўжываньня працы жанчын на машынах і падняцьця іх кваліфікацыі.

Дрэнная арганізацыя быту ў калгасах адбіваецца і на вытворчасьці працы жанчын у калгасе, таму трэба дабіцца лепш арганізаваць быт, каб клопаты ў хаце і дагляд за дзецьмі не адрывалі ў жанчын так многа часу.

Важным пытаньнем таксама зьяўляецца арганізацыя грамадзкага харчаваньня, неабходна дабівацца стварэньня ў замацаваўшыхся калгасах агульных сталовак.

Да гэтага часу ў большасьці калгасаў жанчыны прымаюць яшчэ слабы ўдзел у вырашэньні грамадзкіх і гаспадарчых пытаньняў жыцьця калгасаў, мала жанчын у праўленьнях. У значнай меры перашкаджае гэтаму няпісьменнасьць. Таму арганізаваць вучобу калгасьніц, зьнішчыць няпісьменнасьць сярод іх—зьяўляецца першачарговай задачай.

Аднначасова патрэбна ўзмацніць удзел работніц у рабоце шэфскіх арганізацый, каб праз шэфства дапамагчы ў разьвіцьці калгаснага руху і дабіцца пераходу да сапраўды сацыялістычнага земляробства.

Р-ва.



Сеньненская конфэрэнцыя калгасьніц.



# ПЯЧАТКА

Апавяданьне ГАЛКІ малюнкі ВАЛО

*(Працяг).*

— Яшчэ чаго, з Пракопам. Чаго там? У камісары мецяць бабу, а яна бяз мужа парог не пераступіць—упікнуў Людвік.

Ня сустрэўшы адабрэньня, ці хаця-б спачуваньня, Арына кінулася з хаты. У дарозе яна папракала сябе: „Сораму сем коп, не абярэшся. І навошта я пры людзях прачытаць папрасіла“—лае яна сябе.

Коньмі і пешыя абганялі яе людзі, Арына не прыкмячае нікога, тым самым беражком сыпле дамоў.

А чуткі, як маланка. Пракоп панура спаткаў яе, але ні слова. Сьвякруха-ж заляскацела:

— Мала за сходы людзі на языках, бы на ражнах паносяць. На табе, у Менск яшчэ клічуць, бы бяздомную, якую гуляшчую. Ці няма дзявок у сяле? Матухны мае каханыя!

З Пракопам аб курсах гаворкі не зацявала: сама не набівалася, маўчаў і ён, бы ў рот вады набраўшы.

Пракоп быў чалавек ня злы і ня дурны. Жонку ён шанаваў. Людзям, калі пачыналі папракаць пабягушкамі Арыны, адсякаў каротка, але так важка, што ў другі такое гаворкі не зачыналі. У спрэчкі мацеры з жонкаю—не мяшаўся, затое быў добрым сынам і мужам. Але выпадала рабіўся злым для абаіх, бо ў самы разгар сваркі, як маці, так нават і жонка,—чакалі слова Пракопа, бы слова судзьдзі. Кожнай здавалася, што гэта слова будзе абавязкова ў яе забарону і таму кожная злавалася на скупасьць на слова чаканае. А Пракоп у такія хвіліны ўпарта маўчаў і думаў: „Самі разьбяруцца. Навошта даваць у нечы бок перавагу“.

Невядома да якое-б пары таіў у сабе кожны думкі пра курсы, бо пагутарыць даўно карцела кожнаму. Неяк Сяргей лясьнік у хату зайшоў. Старое дома ня было.

— Хутка ў дарогу таварыш Ліпоўская?—запытаў ён.

— Нявядома яшчэ як з дарогаю будзе,—скрозь зубы працадзіла яна, абмахваючы рушніком зэдлік, запрасіла суседа прысесьці.

— Што ты, што ты? Да мая дні зьлічаны. Ня варта ўхіляцца! Так ці не, я кажу, Пракопе?

Сяргей-аднагодка з Пракопам. Але слова яго—што камень. Нават на сходзе заўсёды лічацца з ім. Бацькі яго зьвекавалі парабкамі панскімі. А сам Сяргей яшчэ ў першыя гады ў партызанах, а пасьля і ў чырвонай арміі за саветы змагаўся. Чалавек ён пісьменны, разьбітны. Зараз Сяргей лясьніком служыць. А ў вёсцы яго комуністым лічаць, бо яшчэ з восені ён стала ходзіць у сумежны сельсавет у партыйную ячэйку.

Вось пагэтаму і тут словы Сяргея вельмі да рэчы. Уплылі яны нават на Пракопа. Сабраўшы ў гармонік лоб, ён так пачаў:

— Чаму-б і не, яно не пашкодзіць. Ды жніво надыходзіць: свае трэба прыбраць, на людзкім зарабіць. Дзе тут у Менск. Як бяз рук заставацца, ці што?

— Скажу табе пасуседзкі, Пракопе—адказаў Сяргей: зроду вы жнеце і косіце, не сваё, а людзкое, і зроду бяз хлеба сядзіцё. А чаму? Жыць не навучыліся? Законы за нас. Вось і трэба больш ведаць гэтыя законы і разам новае жыцьцё будаваць. А жыцьцё гэта новае—супроць Зьмітрыкаў як надойчы ў ячэйцы казалі нам. Розуму трэба больш, свайго не хапае,—у людзей пазычце. Сьвету пабачыць трэба. Вось вам і ўвесь мой сказ.

Пасядзелі яшчэ колькі хвілін. Сяргей пачаставаў тутунам, закурылі і разьвітаўшыся сусед паплёўся дамоў.

Неўзабаве зьвярнулася сьвякруха. Павячэралі, агонь патушылі. У пацёмках доўга яшчэ Пракоп шаптаўся з жонкаю: раіліся, нешта вырашалі.

На другім тыдні Арына скончыла з засевам гароду, памыла бялізну, палатала, хату прыбрала і пачала зьбірацца ў дарогу. Сьвякруха ў сьлёзы кінулася, Пракоп уціхамірыў. Зьмірыўшыся маці стала шаўковай, і нават грэцкіх буханцоў напякла на дарогу нявестцы. Калі-ж Арына асьцярожна паспрабавала вызваліцца ад такой чульлівай клапатлівасьці, старая пакрыўджана замахала рукамі:

— Што ў цябе ў горадзе, сват, ці брат, дзядзька, ці цётка? Нагатаваў нехта прысмакаў, пачастункаў? Памятай, на чужой старане і жук мяса. Зьясі і пальцы абліжаш.

Позна ўночы Пракоп адвёз жонку на станцыю. Па дарозе тлумачыў, каб з клункаў вачэй ня спускала.

— А ў горад прыехаўшы, міліцыянэру паперку пакажы, яны ўкажуць як і куды прайсьці.

Звонам нейкім адбівалі калёсы трывожныя песьні ў галаве Арыны. Сэрца сьціскала невядомасьць, кідала ў жар. Арына перабірала думкі, сартавала іх, спрабавала ўявіць, як гэта яна адважылася кінуць дамоўку, сям'ю? паехаць у Менск самой? І не на дзень, а на цэлых два з паловай месяцы.

— Ай-яй. Няўжо гэта сапраўды? Ростань на такі час. Як без мяне хата, хлеў, поле, дзеці? Калі Лыска звыкла малако аддаваць толькі ёй, Арыне.

Гэты час выдаўся Арыне цэлым жыцьцём.

А калёсы адбівалі такты, страчылі, імчаліся далёка, далёка ўносілі ад вёскі Арыну.

III

Час адкрадаў у года дні. Закрасавала жыта, надышла пахучая касавіца, сьледам за ёю палкае залатое жніво.

Сьвякруха Арыны ламала над пожняю сьпіну старую, расу праводзіла раньнем, сустракала ўвечары. А ўдзень калі сьпёка рабілася нястрыманай, яна праганяла смагу бярозавым квасам, хавала глечык з ім у цяні, распростаўшыся вачыма аводзіла краявід, чакала калі задыміцца дарога.

Каб хутчэй бег час, старая ўспамінала дзявочыя годы і дрыжачым голасам заводзіла:

— Мой міленькі і, Прако-о-паньку,
Прыедзь ка мне-э па ко-о-паньку,
Ды не бяры-ы рубля а з гумна,
Вазьмі ляпей мяне э з поля,
Бо я ў полі-ы стаміла-а-ся стоя.

Прыслухаўшыся да ўласнага голасу, старая яшчэ раз пераконвалася, які незгладзімы адбітак накладае старасьць. Яная спыняла песьню, пачынала блукацца ў плойме ўласных думак.

Краям вуха Пракоп выслухоўваў, як у вёсцы яго называлі „саламяным удаўцом“, кожную надзелю хадзіў у сельсавет за пісьмамі. Там новая асада чакала яго:

— Баба дзяцей нараджала, а сама зьбегла, пакінула мужа цвецам жнецам і ў дуду ігрэцам. Хто ведае, можа зараз ёй не да мужа. Ці мала мужоў на сьвеце—трунілі пустазвоны.

Былі хвіліны, калі ў нутро Пракопа сапраўды запаўзаў чарвячок, пачынаў сьвярдлаваць. Пісьма Арыны рукою зьнімалі ўсё неспакойства.

*„Яшчэ кланяюся мужу майму любаму Пракопу і добрага здароўя жадаю яму. Уніжайшы паклон шлю матцы—Лісавеце, дзетачкам родным маім і горача іх цалую.*

*Як там вы з жнівом упраўляецеся? Напішыце мне, колькі коп нажалі з дзесяціны?*

*Я жыва і здарова. Жыцьцё мае па дзівоснаму ідзе: спаць кладуся з кніжкаю; прачынаючыся з ёю. Дню мала. Навучылі ўжо нас чытаць, пісаць, складаньню, адніманьню і нават палітыку. А сёньні былі мы ў фабрыцы на іскурсіі. Ох і наглядзелася я, надумалася. Што толькі ня вырабляюць машыны розныя. Глядзіш дык здаецца, што з мазгамі кожная машына. А рукі над ёю—бы крыльлі жаўранка ўвясну. Ай, родныя мае, ды якія-ж чараўнікі гэтыя машыны. Прыглядзелася і зразумела, што не навучыліся мы яшчэ жыць. Вось прыеду я—усю праўду далажу: аб калектывізацыі, пра Зьмітрыкавых.*

*У рабочых трэба навучыцца нам.*

*Усё мне падабаецца тут,*



Толькі паўціньня плодзяць.

*толькі высока вельмі прыходзіцца на паверхі ўзьбірацца“.*

*Ваша Арына Ліпоўская.*

І далей дадавала:

*„А буханцы маміны на арэх пасохлі, ляжаць яны дагэтуль: на сьметнік выкінуць шкода, а жывёлы няма каб зьела. Нам далі тут харчы, кватэру, кожнаму ложак асобны і ў ціятры вадзілі нас“.*

Пракоп раздаваў паклоны, а пісьма жонкі, пакруціўшы ў руках, акуратна складаў за абразамі.

IV

Арына ледзь стрымлівала парываньні. На месцы ніяк ня ўседзіш. Раз-по-разу зрывалася, прахаджвала па вагзалу, кідала вокам у бок гадзіньніка.

— Цэлых 40 хвілін прыдзецца чакаць цягніка,—падумала яна і нэрвова забарабаніла пальцамі па шклу.

Па зале мітусіліся людзі, перацягвалі клункі, бегалі. Даўжэнныя лаўкі абляпілі падарожнікі другога гатунку: тыя, каму чаканьне давялося мераць ня хвілінамі, а цэлымі гадзінамі. Ускалмачаныя, яны нудна лупалі вачыма, санліва пазяхалі па чарзе, пры гэтым плюшчылі прыпухшыя вочы і да страхоцьця шырака разьзяўлялі рот. Некаторыя марудна курылі глыбока, з смакам удыхаючы дым. Рэшткі ж, мабыць больш усваячаныя падарожжам,—абіралі мясьціну, скмеціўшы за шыльдаю дыму кіёск, запасаліся чым-небудзь накшталт Зошчанкі, абнімалі чамайдан, прыладжваліся да чытанкі.

Час ад часу ажывала саля. Электрычны ток датаркнуўшыся прыводзіў у рух кожнага.

— А?.. Што?.. Куды?..

— Скажыце, калі ласка, якая гадзіна?

— Ух, дарэмна патурбаваўся.

— Падайце шклянку гарбаты!

За сталом—пярэстасьць: капялюшы, кажухі, лакіркі, чобаты, акуляры, чырвоныя хусткі. Праходзячы па зале, Арына заўважыла сябе ў люстры:

— Белая, ні загарынкі!

Неспадзевана, у тэй самай люстры мільганула знакомая постаць.

— Дзяніс!

Крутнулася да яго:

— Здаровенькі. Куды? Чаго? Як там нашы? Што чуваць нова?—сыпала Арына.

Дзяніс аглядаў маладзіцу з ног да галавы.

— Што там новага? Табе мусібыць давалі знаць...—Дзяніс запнуўся—пра каморнікаў...

— А што?

— Ды тое... Каморнікаў прыслалі, а яны па ўказцы савету: Зьмітрыка на месцы, а нас куды папала. Столькі чакалі мы каморніка, а зараз бачым, куды нашы сельсаветчыкі павярнулі справу. Таго і еду ў горад, за праўдаю—скончыў ён.

— Як-жа так? А заява наша?—пасінела ад абурэньня Арына.

— Эт, дбае Лукаш. Сказаў-бы я табе навошта скарысталі нашу заяву, шаную толькі сёньнешняга дню. Бзыкалі мы, а толку ні на грош, вось што,—злосна выпаліў Дзяніс, плюнуў на падлогу і нагою разацёр.

— З прыгаварам едзеш?

— Не, так, па даручэньню.

— Ня варта было з пустымі рукамі. Патрэбна-б захапіць пастанову людзей,—заўважыла Арына:—сход склікаць.

— Які там сход. Хто кіруе ім? Сяргей выехаў у горад. Ужо месяц як дома няма. Старшыня—Лукаш. А хто-ж і кашу ўсю варыць, хто кулакоў выгараджвае як ня ён?

— Мо лепш вярнуцца табе, сход склікаць?

Дзяніс недаверліва яшчэ раз агледзеў Арыну.

— Эт, выдумала, — варочацца. Адзін толк. Думаеш у Менску пабыла, дык і паслухаюць цябе? Ня інакш—вышэй далажыць трэба.

— Мне пара.—Дзяніс павярнуўся, вышаў на пляцформу.

Хутка цягнік гукнуў і Арыну. Села ў вагон. Уліпла ў шкло. Мэханічна сачыла, як завіваліся рознакаляровыя палосы, шпарка беглі назад тэлеграфныя слупы, скакалі мэндлі з пазадзіранымі галавамі. Яшчэ шпарчэй віліся думкі ў галаве, хвалявалі, біліся, клёкаталі.

— Столькі ўклалі ў галаву курсы! Рвалася хутчэй дамоў, узброеная, каб перабудаваць многае па правільнаму. А зараз, бачыш? Зьмітрыкі з Лукашамі верхаводзяць.

Ну, што я для іх? Баба і больш нічога. Што з таго, што на курсах пабыла? Адна супроць усіх ня выйдзеш.

Арына запнулася:

— Ды што я сапраўды кісну?—уся задрыжала. З глыбіні выплыла рашучасьць, яскравасьць.

— Хіба-ж адна? Не. З беднатою, з усімі, супроць Зьмітрыкаў і Лукашоў. А курсы... О, курсы, бы галаву новую прыладзілі. Знаем як быць павінна.

Эх, каб партыйная ячэйка ў вёсцы была. Паказалі-б мы адразу Зьмітрыкам дзе козы зімуюць! А так—цяжэй.

У вачох Арыны запаліліся агеньчыкі. Яна ўспомніла Ліду—работніцу фабрыкі, дзе была на экскурсіі. Ліда расказвала, як партыйная ячэйка фабрыкі, разам з шэфбюро, арганізавалі калгас у падшэфнай вёсцы. Пад калгас адвялі лепшую зямлю, а кулакоў, за тое, што пагражалі калгасьнікам, на пясок недзе высадзілі.

—Хоць-бы Ліду да нас у вёску—падумала Арына.

Гудок цягніка абарваў яе думкі.

* * *

Нудна-шэраю, лахматаю здалася хата Арыне. Як выехала, так і ня прыбіраў ніхто як сьлед, толькі зьверху дзяркачом падгрeбалі, каб за сьмяцьцё не ўчапіцца Параскідана ўсё: лыжкі, міскі нямытыя; пераплялі куткі і з гары спаўзаюць крэндлі з паўціньня і таму столь здалася яшчэ ніжэйшай—цісьне, гняце.

Адпачыўшы, Арына вышла ў бой з бязладзьдзем. Павыцягвала з хаты ўсё, зацеяла пабелку. Дарэчы работы такое няма: бульбу будзем капаць крыху пазьней. Вытрусіўшы столь, дабралася да кутоў,—наткнулася на абразы. Адхіліла адзін.

— Маткі родныя! Толькі паўціньне плодзяць!

І тут у галаве Арыны ўсплыла даўно народжаная думка:

Зірнуўшы ў вакно на крапыша Уладзю, Арына спакойна пазьнімала абразы, вынесла ў камору, ніц паклала на кубель. З гэтага-ж кута пачала пабелку. А ўвечары, скончыўшы работу, яна ўпрыгожыла ўсю сьцяну прывезенымі з Менску плякатамі і партрэтамі. Пазьней, калі паселі вячэраць, сьвекруха старая ўстала, перахрысьцілася ў куток па прывычцы, і нават ня скмеціла створанай Арынаю перамены. Толькі глянуўшы на нявестку старая зьдзівілася, чаго тая так шчыльна сьціскае губы, стрымлівае ўсьмешку.

*(Працяг будзе).*

**З студзеня месяца часопіс „Беларуская работніца і сялянка“ будзе выходзіць па дэкадам—3 разы ў месяц. Падрабязна аб гэтым будзе паведамлена ў наступным №. Разгорнім шырэй падпіску на часопіс.**



Менская гарадзкая канфэрэнцыя чытачак і рабкорак, якая прыняла пастанову аб пабудове трактару імя „Беларускай работніцы і сялянкі“.

# ДЭЛЕГАЦКІЯ СХОДЫ РАПАРТУЮЦЬ...

## Камунальніцы выклікалі краўчых.

*(г. Магілеў).*

Дэлегацкі сход пры Гарнізоннай пральні пачаў працу з 5 кастрычніка. За гэты час праведзена шэсьць заняткаў. Заслухалі дэлегаткі даклад мясцкому, абгаварылі пытаньні аб ролі прафсаюзаў у сацыялістычнай перабудове гаспадаркі, даклад аб прамысловасьці.



Дэлегаткі Віцебскай шчотачнай ф-кі ўступілі ў брыгады па соцспаборніцтву.

Усіх дэлегатак прымацавалі да практычнай работы ў розных установах.

Былі дэлегаткі і на экскурсіях: у музэі і на мэталюргічным заводзе „Адраджэньне“.

Наведваемасьць сходаў добрая. „Семдзесят пяць падпісчыц на часопіс „Беларуская Работніца і Сялянка“ завербавалі дэлегаткі.

Правёў дэлегацкі сход збор сродкаў на пабудову самалёта „Дэлегатка“. Зараз сабрана 20 рублёў. Некаторыя работніцы парашылі адпрацаваць адзін дзень, альбо поўдня на пабудову самалёта „Дэлегатка“. Зараз наш дэлегацкі сход акрэп, і парашылі дэлегаткі выклікаць на соцспаборніцтва на лепшую работу дэлегацкі сход Магілеўскай швэйнай фабрыкі.

Вось якія ўмовы выпрацавалі дэлегаткі ў дагаворы:

1) 100 проц. наведваньня дэлегацкіх сходаў.

2) Усім няпісьменным дэлегаткам ліквідаваць няпісьменнасьць.

3) Ніводнай дэлегаткі без практычнай працы, інструктаж яе і праверка выкананьня, сачыць за вучотам усёй працы.

4) Прыцягваць актыў жанчын да працы, асабліва мінулагодні склад дэлегатак.

5) Справаздачнасьць дэлегатак за іх працу на жаночых і дэлегацкіх сходах.

6) Добрасумленна адносіцца да вытворчасьці, наведваць вытворчыя нарады і актыўна ўдзельнічаць у соц. спаборніцтве.

7) Усю працу дэлегацкага сходу праводзім на беларускай мове.

8) 100 проц. падпіскі на часопіс „Работніца і Сялянка“ дэлегаткамі. Адначасова завербаваць кожнай дэлегатцы ня менш 3-х падпісчыкаў.

9) Абвяшчаем барацьбу супроць адсеву дэлегатак.

10) Удзельнічаць у друку насьценнай газэты і часопісі „Работніца і Сялянка“.

11) Вясьці выхаваўчую працу і падрыхтаваць лепшых дэлегатак для ўцягненьне ў партыю і КСМ.

12) Усім дэлегаткам уступіць у добраахвотныя арганізацыі: МОПР, ОСО, Прыхільнік Дзяцей і інш.

**Староста дэлегацкага сходу—Немірская.**

**Рэдакцыя просіць дэлегатак Гарнізоннай пральні і швэйнай фабрыкі пісаць у часопіс, як выконваецца імі дагавор, у прыватнасьці, як удзельнічаюць яны ў ударных брыгадах і сац. спаборніцтве на вытворчасьці.**

## Дэлегаткі спаборнічаюць.

Дэлегацкі сход у вёсцы Залуж'е выклікаў на спаборніцтва Старадароскі дэлегацкі сход.

Сходам пастанавілі: 1) садзейнічаць хутчэйшай калектывізацыі вёскі, 2) арганізаваць калектыўную здачу ільну спажывецкаму таварыству, 3) выявіць і каапэраваць усіх бяднячак вёскі, 4) ліквідаваць няпісьменнасьць сярод жанчын, у першую чаргу сярод дэлегатак, і па ўсіх гэтых пунктах вызваць на спаборніцтва вясковы Новадароскі дэлегацкі сход.

Дэлегацкі сход завадзкога раёну пастанавіў вызваць на спаборніцтва местачковы дэлегацкі сход.

**Ц. Я. Хініч.**

**Рэдакцыя просіць дэлегатак напісаць, як выконваецца спаборніцтва ў Старадароскім раёне.**

## Праца дэлегацкага сходу саўгасу „Велінь“.

*(Пухавіцкі раён).*

У саўгасе „Велінь“ першы раз абралі дэлегацкі сход. Зараз праца сходу разгорнута. Дэлегаткі сабралі 54 мяшкі. У зьвязку з пяцігодзьдзем „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ ўсе дэлегаткі падпісаліся на часопісь на цэлы год, таксама правялі працу і сярод сялянак акаляючых вёсак і сабралі на 56 рублёў падпіскі.

Уступілі ў касу ашчаднасьці і завербавалі ўкладчыкаў на 40 рублёў.

Усе дэлегаткі наведваюць лікбез і адна адну выклікаюць на сацспаборніцтва па хутчэйшай ліквідацыі няпісьменнасьці.

**Слаўковіч.**

## Дэлегаткі за працай.

Дэлегаткі Гарадка рэалізавалі 3-яй пазыкі індустрыялізацыі на 500 рублёў, падпіску аформілі і першы ўзнос унясьлі ў колькасьці 150 рублёў.

Гарадоцкі дэлегацкі сход пастанавіў выклікаць на сац. спаборніцтва па ўсім пытаньням працы дэлегацкага сходу Лёзьненскі дэлегацкі сход. Абрана камісія з 7 асоб, для апрацоўкі праэкту ў хуткім часе прадстаўнікі дэлегацкага сходу паедуць у Лёзна заключыць умову.

**Жураўлёва.**

# „Чырвоны Берag".

Па кочках, прыкрытых тонкім слоем першага сьнегу, едзем у калгас. Вось ужо сквозь натаўп стройных хвоек відаць белыя крышы і сьцены. Глуха даносіцца шум малатарні з вялікага, крытага новым гонтам будынку.

Гэта калгас „Чырвоны Берag". На краю пекнага возера ў былым панскім маёнтку вырас калгас. Ён яшчэ зусім малады: толькі першы ўраджай зьнялі калгасьнікі з палёў.

Трохі пашкодзілі летась марозы жыта, затое аўсы далі на 20 пудоў з гэктара больш ураджаю. Забясьпечылі сябе калгасьнікі гатунковым насеньнем для будучых пасеваў. Ярка блішчыць у жмені авёс „залаты дождж".

Ідзем аглядзець жывёлу. Ужо цямнее. Пры сьвеце ліхтара бачым бойкіх ружовых парасят: у будучым яны дадуць вялікі прыбытак у гаспадарцы. Радам з іакшырскай парodaй, у асобных стойках, простыя сьвіньні, але палепшанай ужо пароды.

А вось гонар калгасу—высокі з стройнымі тонкімі нагамі кары конь арлоўскай пароды—ён набыты на сельска-гаспадарчай выстаўцы.

Калгас з жывёлагадоўчым ухілам; за год жывёлагадоўля значна пашырылася. Набылі новых 24 каровы, так што кароў цяпер ужо 47 галоў і цялята гадуюцца, коняй было 7, а цяпер—19, сьвіней—12, ды маладняку галоў 20.

У калгасе на 17 сямей 316 гэктараў, а членаў 58. Многа прыходзіцца працаваць калгасьнікам, але яны бадзёрыя.

Вось—возера, з яго таксама калгас будзе мець прыбытак, толькі трэба рыбную гаспадарку паставіць.

За гэты час набылі калгасьнікі і некаторыя сельска-гаспадарчыя машыны: малатарку, жняярку, касарку, радавы і клеверны сеўнік, сэпаратар, саламарэзку.

Палегчылі машыны жыцьцё жанчыны, але толькі не навучыліся яны на машынах працаваць, трэба гэтага калгасьніцам дабіцца. Зараз ужо паслалі адну калгасьніцу на курсы трактарыстых.

За роўную работу жанчыне ў калгасе аплачваецца так, як і мужчыне.

Пабудавалі клюб у калгасе, але толькі культурная работа яшчэ адстае. Жанчыны амаль усе няпісьменныя, а ў лікпункце займаюцца мала. Трэба, каб з тымі, хто ня можа хадзіць на лікпункт, асобныя заняткі ў калгасе наладзіць.

Есьць і дэлегацкі сход, але ён толькі яшчэ распачаў сваю працу і пытаньнямі калгаснага жыцьця не займаўся. А гэта патрэбна, бо калгасьніцы мала разьбіраюцца ў справах калгасу—таму і ёсьць сярод іх зусім нягодныя настроі. Некаторыя і такія думкі маюць: чым прыбытак на палепшаньне гаспадаркі даваць, дык лепш на гэтыя грошы адзеньне і іншыя рэчы купіць.

А ёсьць і такія несьвядомыя, як Галенчыха, якая цёткам з вёскі кажа: „Ня ідзеце ў калгас, бо ў вёсцы лепш". І дачку сваю, якая вучыцца на курсах трактарыстых, угаварвае вучобу кінуць.

Зусім мала ўдзельнічаюць жанчыны ў вырашэньні спраў калгасу. На сходах хоць і прысутнічаюць, дык больш маўчком. Да і ў праўленьні калгасу жанчын няма. Зараз сход калгасьніц прымацаваў дэлегатку да праўленьня калгасу.

Улетку калгасьніцы мелі ясьлі, яны добра працавалі і іх парашылі заставіць для сталай работы.

**Н.**

Багушэўскі р-н, Аршанскай акр.

**Калгасьніцы, пішэце, як вы падрыхтаваліся да вясеньняй пасяўной кампаніі.**

## Будзем выконваць заветы Леніна.

Камуна „Чырвоная Зорка", Полацкага раёну, за апошні год значна ўзрасла. Зараз пад камунаю 1500 гэктараў. Батракі і беднякі актыўна ўступаюць у камуну.

Калі сялянкі ішлі на сход у камуну на перавыбары СКСУ, то іх запалохвалі кулакі, а калі ўбачылі яны, як жывуць камунары, агледзелі ясьлі, дзе дзеці камунараў знаходзяцца ў добрых умовах, батрачкі і бяднячкі зразумелі карысьць каляктыўнага жыцьця.

Сход жанчын заявіў: „Больш мы кулацкай хлусьне верыць ня будзем. Мы аднагалосна пастанаўляем уступіць у камуну „Чырвоная Зорка" і шчыра будаваць сацыялізм, даючы рашучы адпор кулаку і падкулачніку. Мы, жанчыны будзем выконваць заветы Ільліча.

**У. Рублеўская.**



Дзеці калгасу займаюцца фізкультурай.

# РАБКОРКІ ПІШУЦЬ.



Галя Целенг.

## Мы будзем кваліфікаваццa.

Галя Целенг была пастаўлена бронькаю ў машынным аддзяленьні.

Некаторыя падсьмейвацца пачалі:

— Выдумала, у майстры лезе. Гэта-ж куры сьмяяцца будуць!

Прышлося праводзіць растлумачальную работу, каб стварыць навокал вылучэнкі добрую грамадзкую думку.

Старанна ўзяліся за абучэньне майстры, ды і сама Галя паставіла мэтай работаю даказаць здольнасьць быць майстрам.

Праз 5 месяцаў Галя сама кіравала машынай, яна зараз працуе дапаможнікам машыністага.

Вылучэньне Галі для нас мае вялікае значэньне, яно разьбівае яшчэ ня зьнішчаны сярод адсталай часткі погляд, нібы жанчына ня можа быць майстрам на шклозаводзе.

У нас ужо быў выпадак, калі работніца жадала вучыцца баначнікам, але яе не дапусьцілі на гэту работу. Зараз мы таксама паставілі адну работніцу вучыцца баначнікам.

Трэба зьнішчыць канчаткова стары погляд на вылучэньне жанчын і даць магчымасьць работніцам павышаць сваю кваліфікацыю.

**Казіміроўская.**

Шклозавод „Кастрычнік".

## Прагрэсаўшчыцы не адстаюць у сацыялістычным спаборніцтве.

На агульным сходзе работніц і рабочых Менскай цукернай фабрыкі „Прагрэс" падвялі вынікі выкананьня дагавора па сацспаборніцтву, які быў заключан у маі гэтага году з гомельскай і магілеўскай фабрыкамі.

Як-жа выканалі мы свой дагавор?

Мы з гонарам можам сказаць, што „прагрэсаўцы" поўнасьцю ўявілі значнасьць і неабходнасьць сацспаборніцтва для хутчэйшага разьвіцьця прамысловасьці і выкананьня пяцігадовага пляну.

У першыя месяцы пасьля заключэньня ўмовы актыўнасьць таварышоў была недастаткова і ўдарныя брыгады слаба праяўлялі сябе. Затое пасьля растлумачальнай работы, праведзенай ячэйкай і заўкомам па ўсім цэхам і на рабочых сходах, выяўлены і ўстаноўлены недахопы мяшаючыя ходу спаборніцтва. Сьвядомая актыўнасьць рабочых і работніц узьнялася на належную вышыню.

У завёртачным цэху па пачыну камсамольскай ячэйкі арганізаваны дзьве ўдарныя брыгады, якія сябе апраўдалі.

Падняцьце вытворчасьці працы па дагавору на 5 проц. выканана ўсімі работніцамі, зьменшаны значна прагулы, асабліва па няўважлівым прычынам. Сачаць работніцы адна за другой, каб не спазьняцца на работу. Скараціліся лішнія размовы ў цаху. Брак зьнізілі да 1,02 проц.

Завёртчыцы спаборнічаюць паміж брыгадамі, а таксама і паміж асобнымі работніцамі.

З такім-жа ўздымам праходзіць спаборніцтва і ў іншых цэхах: карамельным, шакаладным, бісквітным.

Замест 2 проц. брак давялі ў карамельным цаху да 1,02 проц., норму выработкі павысілі на 12—20 проц.

Накладныя расходы па фабрыцы зьніжаны на 20 проц., а сабекоштоўнасьць на 3,06 проц.

Ва ўсіх цэхах працуюць ударныя брыгады. За актыўную працу па сацспаборніцтву 12 работніц атрымалі прэміі.

Але ў шэрагу з дасягненьнямі ёсьць і недахопы. Так, слаба кіруе вытворчая камісія сацспаборніцтвам, работніцы, якіх на фабрыцы да 75 проц., недастаткова ўдзельнічаюць у вытворчых нарадах.

Цэхавыя і агульныя сходы таксама наведваюць ня ўсе, а на іх абгаварваецца многа вытворчых пытаньняў.

Праэкт новага дагавора ўжо абгавораны на сходзе рабочых і работніц. Вопыт мінулага году дасьць магчымасьць выканаць дагавор на 100 процантаў.

Прагрэсаўцы ўзятыя на сябе абавязкі выканаюць.

**Дорская.**

**Рэдакцыя чакае водгукаў ад работніц Гомельскай і Магілеўскай фабрык аб тым, як яны выконваюць сацдагавор.**

## Ажывілася работа.

У гэтым годзе ў рабоце сярод жанчын нашай фабрыкі адчуваецца ўздым. Пачаў працу дэлегацкі сход, усе дэлегаткі прымацаваны для практычнай работы да камісій і сэкцый гарсаветаў.

Два разы ў месяц праводзяцца сходы работніц і жонак рабочых. Жонкі рабочых парашылі адпрацаваць адзін дзень на пазыку індустрыялізацыі.

Няпісьменныя работніцы і жонкі рабочых наведваюць лікпункт, 4 жонкі рабочых не змаглі наведваць лікпункт, бо ёсьць маленькія дзеці, дык да іх пасылаюць кіраўнікоў на кватэру вучыць.

У падшэфнай вёсцы Струпні таксама арганізаваны дэлегацкі сход, працуе школа кройкі і шыцьця, праводзяцца 2 разы ў месяц сходы сялянак.

Адно вельмі кепска: работніцы ў сваёй актыўнасьці адстаюць ад жонак рабочых. Сходы наведваюць горш і ў практычнай рабоце менш жонак удзельнічаюць.

Трэба спадзявацца, што ў далейшым работніцы ня будуць адставаць.

Ф-ка Прафінтэрн.

Работніца **Шуб.**

**Рэдакцыя просіць работніц фабрыкі „Прафінтэрн" адгукнуцца на гэту заметку і высьветліць прычыны, якія перашкаджаюць работніцам прымаць належны ўдзел у грамадзкай рабоце.**

---

## РАБКОРКІ!

**Пішэце, як працуюць работніцы вылучэнкі, як справа з кваліфікацыяй і вучобай работніц. Пішэце аб недахопах, якія Вы заўважваеце.**

---

## Як працуе наша сталоўка.

*(Фабрыка Дзьвіна).*

Многа гутарылі дэлегаткі аб рабочай сталоўцы. Урэшце дачакаліся. Хоць памяшканьне і маленькае, але спачатку хапала. Зараз сталоўка не пасьпявае эдаволіць усіх харчуючыхся.

Памяшканьне сырое, цеснае, у кухні брудна, няма дзе павярнуцца, але магчыма трымаць чысьцей: повар парцыённае кладзе рукамі на талерку, попел з люлькі сыпецца ў кацёл. Абеды гатуюцца нясмачна і брудна. З дзьвюх гадзін абедаў у сталоўцы ўжо няма і работніцы, якім трэба ў 3 гадзіны ісьці на работу, застаюцца без абеду, на сухім хлебе. Работніца, якая ходзіць у школу, ня можа гатовіць абед дома, а ў сталоўцы абедаў не хапае.

Для таго, каб уцягнуць больш работніц у грамадзкую работу, трэба наладзіць работу бытавых установў. **Т. С.**

## На Індустрыялізацыю.

Работніцы, сябры саюзу Нархарч, Жыткавіцкага раёну, атрымоўваюць зусім мізэрны заработак. Ня гледзячы на гэта, яны ўсе як адна падпісаліся на месячны заработак на трэцюю пазыку індустрыялізацыі і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу Мазырскі і Калінкавіцкі мясцкомы Нархарч.

**А. Хмялеўская.**

## Жонкі чыгуначнікаў падпісаліся на 3-ю пазыку.

На станцыі Жыткавічы, Заходняй чыгункі, на 3 пазыку індустрыялізацыі падпісаліся хатнія гаспадыні чыгуначнікаў.

Падпіскай ахоплена 25 жанчын, якія падпісаліся на 645 руб. і выклікаюць усіх хатніх гаспадынь Заходняй чыгункі пасьледаваць іх прыкладу. **М. Жукава.**

## Не адстанем.

На агульным сходзе работніц і хатніх гаспадынь станцыі Віцебск была вылучана камісія па рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Падпісалася на пазыку індустрыялізацыі 177 хатніх гаспадынь на 1960 рублёў.

Вынесена пастанова адпрацаваць адзін дзень у карысьць абароны краіны. Сабрана грашыма 9 рублёў 25 капеек і 2 залатых пярсьні.

**Куксінская.**

Віцебск.

## Трэба арганізаваць быт.

Наша фабрыка „Беларуска" (галянтарэйная) пабудована ў гэтым годзе.

На фабрыцы працуюць 240 чалавек, з іх работніц 140 чалавек.

Ёсьць у нас дэлегацкі сход у 40 дэлегатак. У сацспаборніцтве ўдзельнічаюць усе работніцы. Маюцца ўдарныя брыгады.

Ня гледзячы на кароткі тэрмін існаваньня фабрыкі, мы маем ужо работніц-вылучэнак—старшых па цэхах.

Нядаўна мы прэміравалі лепшых работніц. Залатарова атрымала ў прэмію 25 рублёў, Цьвік—20 рублёў, яна першая выпрацавала звыш нормы па эборцы гузікаў.

Залатарова—малапісьменная, што крыху перашкаджае ёй ў працы. Зараз яна вучыцца.

Цьвік—эьяўляецца выхаванкай дзіцячага дому, яна маладая работніца, але працуе вельмі аддана.

Работніцы фрэзэрнага цэху самі падалі заяву аб павышэньні нормы.

Але ёсьць на фабрыцы і такія, як Малановіч: хоць яна і дэлегатка, кваліфікаваная работніца, але наш рабочы калектыў аднадушна асудзіў яе, як сімулянтку, склочніцу, а, галоўнае, за тое, што Міловановіч хавала норму вытворчасьці, за што і была зволена з працы.



Дэлегаткі зьезду ўдарнікаў.

Кепска тое, што пры фабрыцы няма ніякіх дзіцячых установў, няма сталоўкі, гэта дрэнна адбіваецца на становішчы работніц.

У новы калектыўны дагавор унесьлі работніцы прапанову, каб работніц больш вылучалі на адказныя работы.

Работніца Залатарова абрана агульным сходам дэлегаткай у Охценскі хімзавод, дзе вырабляюць целулоід,—для подпісу дагавору па сацспаборніцтву і азнаямленьня з жыцьцём работніц і рабочых заводу.

**Буніна.**

Менск.

## Камісія па ахове працы сьпіць.

*(Галянтарэйная фабрыка „Беларуска").*

Зусім не працуе камісія па ахове працы на галянтарэйнай фабрыцы. Возьмем зубанарэзачны цэх: там праца шкодная, а камісія ніколі і не загляне ў цэх. Разбурыўся вэнтылятар у грабёначным цэху ў начную зьмену, а камісія ніякіх мер ня прыняла. Гэта адбіваецца на здароўі работніц.

**Трэба каму належыць прабудзіць камісію па ахове працы.**

**Рабкорка Маркава.**

## Пакажэце нам шэфаў.

У пачатку 1928 году ў вёсцы Яснаўка шэфы арганізавалі лікпункты, дзе крыху мы навучыліся чытаць часопісь і выпісалі „Беларускую Работніцу і Сялянку".

Але з таго часу мы ня бачылі шэфаў, і дзякуючы таму праца ў нас заглохла, лікпункт ня існуе.

Мы хочам гэта высьветліць на старонках сваёй часопісі, каб нашы шэфы сталі наведваць нас і распачалі працу. **Чабор М.**

Сьмілавіцкі р-н, Менскай акр.

## Шэфы, а дзе вы?

Шэфы Рудзенскага сельсавету забыліся аб падшэфных вёсках. Ніякай працы не вядуць; ужо амаль цэлы год, ня было іх у Раўнапольлі, дзе цяпер арганізаваўся калгас пад назваю „Савецкая Беларусь", у які ўвайшло каля 45% сялянак. А таксама ад таго часу ня былі і ў Рудзенску.

Хто іх разбудзіць? **Чабор М.**

Сьмілавіцкі р-н, Менскай акр.

Рэдакцыя просіць селькораў паведаміць, якія арганізацыі шэфствуюць над паказанымі вёскамі.

# Недахопы пад абстрэл

**Пралетарскай самакрытыкай рашуча ўдарым па безгаспадарчасьці, сямейственнасьці, парушэньні клясавай лініі ў рабоце. Рабселькоркі, сьмялей выкрывайце шкоднікаў, бюракратаў, клясава-чужых людзей, дапамагайце партыі ў яшчэ больш пасьпяховым сацыялістычным будаўніцтве.**

## Перашкаджаюць калектывізацыі.

У вёсцы Улужжа, Круглянскага раёну, актыўна арудуюць кулакі, каб пашкодзіць у арганізацыі калектыву і бяднячак запалохаць:— калі запішашся —век будзеш памятаць,—пагражаюць кулакі.

А што робіць ячэйка? Партыйцы растлумачваюць беднаце і серадняцтву карысьць калектываў, выкрываюць кулакоў.

Але ёсьць і такія партыйцы, напрыклад, Вялікарусаў Д., які на словах за калгас, а сам уступаць ня хоча, і хавае сваю гаспадарку за жонкай. Трэба ячэйцы і райкому гэтым пацікавіцца.

**Т. К**

## На кулака—вокам, а к бяднячцы—бокам.

Галавачыха Настаха за восем вярстоў пехатурыла ў Багушэўск. Ня лёгка гэта старой, 8 вёрст туды і назад столькі-ж, ды яшчэ 59 год за плячыма.

Але што-ж зробіш, калі шына на кола патрэбна: няма шыны— няма воза, а разам няма заработкаў.

Дык вось Настаха даграблася да Багушэўску, і прасьцяком у крэдытнае таварыства:

— Як-бы шыну атрымаць?— зьвярнулася яна да прыказчыка Багдановіча.

— Давай кніжку каапэратыўную,—адказвае Багдановіч.

Настаха аж за галаву ўхапілася—кніжку яна дома забыла. Але з ёю паперка сельсавету. Сельсавет сьведчыць, што Настаха сапраўды бяднячка і ёй неабходна шына.

Але Багдановіч суровы чалавек, у яго „свае законы".

— Ня прызнаю ні савету, ні бяднячкі. Давай кніжку каапэратыўную, ці купі аблігацыю пазыкі, тады і шыну дам,—камандуе Багдановіч.

Людзі ўступіліся за Настаху, сьцьвярджаюць, што ведаюць яе, грошы яна на мыцьці людзкой бялізны на шыну сабрала, ручаюцца, што кніжку яна пасьля прынясе. Словы ўсе гэтыя ад Багдановіча, бы гарох ад сьцяны.

Настаха змушана была вяртацца дамоў за кніжкаю, такім чынам у чатыры канцы зрабіць 32 вярсты.

Урэшце яна зноў у крэдытным таварыстве, прынесла кніжку каапэратыўную.

Але... Шына ўжо прададзена. Багдановіч выдаў яе заможніку— ня-пайніку каапэрацыі, які мае добрых пару калёс.

— Ну, што-ж, і выдаў, бо ён у мяне аблігацыю пазыкі ўзяў,— нагла апраўдваецца Багдановіч.

Паганаю мятлою трэба гнаць такіх Багдановічаў, якія ня прызнаюць савету, зьдзекваюцца з бяднячак, клапоцяцца аб кулаках.

**Немаўклівая.**

**Ад рэдакцыі:** Рэдакцыя чакае адказу па гэтаму допісу ад Праўленьня Днепрасаюзу.

## Больш прыцягнуць жанчын да стварэньня калгасаў.

Сярод нашых сялянак зусім мала праводзіцца работа па пытаньнях калектывізацыі. Некаторыя бяднячкі і сераднячкі зусім ня ведаюць, што такое калгас, а кулацтва гэта скарыстоўвае і імкнецца больш адсталых жанчын запалохаць. Трэба праводзіць сталую работу з жаночым актывам.

**Г. Званковіч.**

в. Лескі, Глускага р-ну.

## Такіх непатрэбна ў рабочай сям'і.

Матальны цэх фабрыкі „Дзьвіна" абвясьціў сябе ўдарным. Парашылі работніцы, для таго, каб зьнізіць брак,—самім разьбіраць абмотышы і вынесьці скрынкі для абмотышаў, дзе раней гніла пража. Гэта дало эканомію і на рабочай сіле, бо дало магчымасьць убраць з цэху 2-х рабочых, якія ставілі гэтыя скрынкі. Уся 1-ая зьмена згадзілася ўбраць скрынкі.

Але ў другой зьмене 12 работніц адмовіліся быць ударніцамі.

Работніца Роза Хазан сама ня хоча быць ударніцай і разлагае другіх работніц, а тых актывістак, якія вядуць растлумачальную работу і даюць прыклад у вытворчасьці,—ганьбіць непатрэбнымі словамі.

**Работніца.**

# Што зроблена па допісах рабселькорак

## Недахопы будуць зьнішчаны.

Наркамат РСІ паведамляе, што пры расьледваньні допісу селькоркі "Беларускай Работніцы і Сялянкі", якая пісала аб становішчы **школы мэдсясьцёр**, высьветлена: беларусізацыя ў школе на ўсе 100 проц. не праведзена, недастаткова праведзена выхаваўчая работа і разгортваньне самакрытыкі, ёсьць выпадкі безгаспадарчасьці: намесьнік старшыні чырвонага крыжу незаконна захапіў пад сваю кватэру жылую плошчу школы, што стварыла цяжкія антысанітарныя ўмовы ў інтэрнатах школы.

Усе гэтыя зьявішчы НК РСІ прапанаваў зьнішчыць. Загадчыку школы **Стэльмашэнку** за ўпушчэньні па гаспадарцы і сямейственнасьць у пытаньні грубасьці настаўніка пастаўлена на від.

## Зьняты за бязьдзейнасьць.

**Межанскі Райком** партыі паведамляе, што кіраўніцтва **малочнай арцелі Патомінскага сельсавету** пераабрана за прыхільнасьць к заможнікам і бязьдзейнасьць.

## Вымова з папярэджаньнем

Вынесена парткалектывам заводу „Ноўка" **Палінеўскаму Ігнату**, за тое, што рознымі хуліганскімі ўчынкамі перашкаджаў працы жонкі-вылучэнкі.

Аб гэтым нас паведаміла Віцебская кантрольная камісія.

## Атрымалі партспагнаньні

Распушчана бюро ячэйкі за дрэннае кіраўніцтва жанпрацай у **Цацерыне** і вінаватыя атрымалі партспагнаньні. Зараз абрана бюро ячэйкі ў новым складзе. Кіраўніцтва працаю палепшылася—паведамляе Круглянскі Райком КПБ.

# Старонка няпісьменнай

*(Гутарка з чытачкамі-актывісткамі аб навучаньні грамаце).*

Таварышы чытачкі-актывісткі! Вы ўзяліся навучыць грамаце адну ці некалькі няпісьменных жанчын. Магчыма, што ў вас ня знойдзецца пад рукой лемантара для заняткаў і мала будзе часу, каб параіцца з вопытным ліквідатарам няпісьменнасьці аб тым, як лепш вучыць.

Але ваша шчырае заданьне навучыць грамаце няпісьменную будзе парукай за посьпех.

Разам з вамі мы пабудуем заняткі па навучаньню такім парадкам, каб вам самім падрыхтавацца да заняткаў, і з посьпехам выканаць узяты на сябе вельмі важны палітычны і грамадзкі абавязак.

„Старонка няпісьменнай“ дае асноўны мэтадычны і лемантарны матар'ял для чытаньня, пісьма і лічэньня, а ў дадатак да яго вы скарыстаеце па сваёй ініцыятыве і нашых указаньнях матар'ял усіх № часопісі.

„Старонка няпісьменнай“ дае матар'ял на некалькі дзён работы, з вызначэньнем матар'ялу на кожны дзень. Увесь матар'ял гэтак званага „лемантарнага перыяду“ разьлічаны на 30—36 дзён заняткаў, пасьля чаго пойдзе матар'ял для малапісьменных.

### Як-жа мы будзем вучыць грамаце?

Ёсьць два асноўных мэтады навучаньня грамаце—гукавы і мэтад цэлых слоў і складоў. Галоўная цяжкасьць у навучаньні па гукаваму мэтаду—гэта раскладаньне складоў на гукі і зьліваньне гукаў у склады.

Возьмем, напрыклад, досыць лёгкае слова **„наша“**. Тут два склады „на“-„ша“. Няпісьменнаму вельмі цяжка ўявіць, што ў складзе „на“ два гукі „н“ і „а“, а яшчэ цяжэй зьліць гэтыя два гукі ў склад „на“. Няпісьменны часта зьбіваецца на няправільным вымаўленьні гукаў. Замест гука Н-Н-Н, ён вымаўляе „ЭН“, ці „НЭ“ і тады пры зьліваньні ў яго выходзяць неразумелыя склады „НЭА“, ці „ЭНА“. Вучоба робіцца маруднай, прыгнечвае настрой дарослага вучня, адганяе ахвоту. Ёсьць многа прыкладаў, што чалавек ведае ўсе літары паасобку, але ня можа прачытаць ніводнага слова і застаецца няпісьменным.



Лікбез у калгасе.

Мы будзем вучыць не па гукаваму мэтаду, а пановаму мэтаду „цэлых слоў і складаў“. Будзем пачынаць з цэлых поўных слоў, потым пераходзіць да складаў, і далей—знаёміцца з літарамі і гукамі і складаць новыя склады і словы. Гэты мэтад дае магчымасьць адразу пачаць пасьля размовы чытаньне. Ён дае магчымасьць адразу чытаць тэкст, які мае сэнс, замест чытаньня складаў і слоў бяз сэнсу. Ён вядзе ад вядомага да невядомага.

---

### 1-ы дзень работы.

Вучні павінны мець алоўкі і сшыткі ў адну лінейку. Да заняткаў вы падрыхтуйце палоску паперы, на якой напішыце досыць вялікімі друкавымі літарамі сказ: **наша работа**. Літары аднолькавай велічыны. Літара „А“ бярэцца вялікая, а не малая (а), у працягу першых 3-х дзён работы, а далей яны ўжываюцца разам.

Каб падвесьці вучняў да больш глыбокага разуменьня сказу—НАША РАБОТА, вы спачатку правядзіце с імі гутарку па малюнкам часопісі № 22.

Хто тут намаляваны? Работніцы, актывісткі. Што яны робяць? Вучацца, працуюць за машынамі, прымаюць удзел у грамадзкай працы. З якога часу жанчыны-работніцы атрымалі правы? Якія правы мы атрымалі? На якой рабоце цяпер мы бачым жанчын? А што работніца і сялянка мела раней? Ці можна цяпер абыйсьціся бяз нашай работы ў сацыялістычным будаўніцтве?

Потым вы прачытайце па свайму выбару той артыкул з часопісі, які больш падыходзіць да слухача. Можна застанавіцца на артыкуле „Макарыха“, „Батрачка—кіраўнік саўгасу“, ці другія.

Пасьля чытаньня ў вывадзе высьвятліце ролю жанчыны.

Далей вы адзначаеце, што свае думкі мы перадаем нашай мовай, а мова складаецца з слоў і цэлых сказаў, з некалькіх слоў.

Словы асобна вымаўляецца, асобна друкуецца і пішацца. Напрыклад, слова „Макарыха“ вымаўляецца за адзін раз і друкуецца асобна; склад „Батрачка—кіраўнік саўгасу“ вымаўляецца за тры разы, бо тут тры словы, якія асобна і друкуюцца.

Потым пакажыце вучням надрукаваны вамі сказ: **„Наша работа“** і выразна яго прачытайце, паказвая рукой кожнае слова.

Потым чытаюць вучні хорам, а вы адзначаеце кожнае слова рукой. Колькі тут слоў? Два. Першае? Другое? Разрэжце сказ на дзьве часткі, перастаўце словы і дайце чытаць вучням. Потым вучні чытаюць такім-жа парадкам сказ у часопісі.

Далей вы пакажыце вучням, як вы друкавалі (замалёўвалі) сказ **„наша работа“** і зноў напішыце друкаванымі літарамі сказ, каб вучні бачылі, як трэба сядзець, трымаць аловак і паперу, і як паступова пры пісьме рухаецца ваша рука. Пасьля гэтага вучні самі друкуюць у сшытках гэты сказ некалькі разоў, спачатку гледзячы ў часопісь, а потым па памяці.

Далей вы прапануйце вучням прагледзець на старонках часопісі лічбы да 10, пакажыце, як пісаць 1 і 4, няхай вучні запішуць іх у сшытак некалькі разоў.

Пры чытаньні сказу з часопісі пажадана, каб апошні матар'ял, вызначаны на наступныя дні, быў прыкрыты аркушам паперы.

### 2-гі дзень.

Вы чытаеце падрыхтаваны вамі сказ „**Наша работа**" па складах, выразна, з значнымі перапынкамі, а вучні прыслухоўваюцца, потым паўтараюць, адзначаючы склады.

За колькі разоў мы прачыталі слова „НАША"? Які першы склад (частка)? Другі? Гэтак-жа разьбіваецца на склады слова „РАБОТА". Далей чытаюць па часопісі 1 і 2 заданьне і адзначаюць склады.

Вы разразаеце палоску „НАША РАБОТА" на склады і правяраеце ў парадку і ў разьбіўку, як вучні запомнілі склады. Шукаеце знаёмыя склады „РА", „БО" на вокладцы часопісі ў слове „Работніца".

Потым вучні замалёўваюць кожны склад паасобку (па некалькі разоў) у сваіх сшытках. Складаеце з вучнямі новыя словы з знаёмых складаў: рана (два значэньні слова—рана на целе, рана ўсталі), рата (дагавор па найму), тара (упакоўка), Наташа і гэтак далей. Замалёўваньне новых слоў у сшытках.

Пісаньне лікаў 7 і 10. Зьвярніце ўвагу вучняў на напісаньне нуля: дужка з левага боку, дужка з правага боку. На другі дзень можна ўвесьці атрамант, асадкі.

Закончыцца дзень чытаньнем артыкулу з часопісі.

### 3-ці дзень.

Заняткі праводзяцца па прыкладу першых двух дзён.

Новыя склады замалёўваюцца, з іх новыя словы і сказы камбінацыі, з вылучанымі складамі другога дню. Напрыклад: шыла, рамы, маша, наша.

Уводзіцца вялікая літара ў пачатку сказу і кропка ў канцы сказу.

Пры пісаньні лікаў 6 і 9 зварочваецца ўвага на правільнае пісаньне элемэнтаў—дужка вялікая з левага боку, малая з правага боку ўнізу (6) і гэтак далей.

Лічэньне (вуснае) да 20 і наадварот, двойкамі і тройкамі. Чытаньне артыкулу на тэму аб працы.

### 4-ты дзень.

Плян работы той-жа. Уводзіцца літара „а" (малое „а"). Пры друкаваньні „А" зьвярніце ўвагу на напісаньне „а"—спачатку дужку з левага боку ўнізу, потым з правага боку кручок.

Разгледзьце з вучнямі надрукаваныя склады „МА", „МА" і гэтак далей. Чытайце працяжна склад НА. Які гук чуецца ў канцы? Паказваеце склад НА, які складаецца з дзьвух асобных літар разразной азбукі, зноў чытаеце працяжна, адсоўваючы ў бок літару А. Потым вучні гэтак-жа вылучаюць А з складоў ма, ша, ра і гэтак далей.

Замалёўваньне складу „НЫ" і складаў на „а". Складаньне новых слоў і сказаў. Адшукайце з вучнямі знаёмыя склады ў часопісі, знаёмыя словы і літару А.

Пісаньне лікаў 2, 3, 5. Лічэньне пяцёркамі да 100 і наадварот. Літара А пакуль што ня друкуецца і ня пішацца асобна.

1.

НАША РАБОТА — 1 4

РАБОТА НАША — 1 4

2.

| НА | ША | | РА | БО | ТА |
|---|---|---|---|---|---|

НА, ША, РА, БО, ТА — 7 10

7 10

3.

Мы на работу.
Мы за машыну.
На работу мы.
За машыну мы.
Мы на ра-бо-ту.
Мы за ма-шы-ну.

МА, МЫ, ТУ, ЗА, ШЫ, НУ

6 9

6 9

4.

Наша работа.
Мы на работу.
Мы за машыны.
Мы за ма-шы-ны.

| МА | НА | ША | РА | ТА | ЗА | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ма | на | ша | ра | та | за | ны |

НА-А-А А — 2 3 5

на-а-а а — 2 3 5

# ПАРАДЫ АГРАНОМА

## БОЛЬШ НАЗАПАСІЦЬ ГНОЮ.

Самым галоўным нашым угнаеньнем, нават пры шырокім ужываньні мінэральных тукаў, заўсёды будзе гной. Уносячы гной, мы ўносім усе неабходныя расьлінам спажыўныя рэчы і акрамя таго, узбагачаем глебу перагноем і паляпшаем яе (так званыя фізычныя ўласьцівасьці), дапамагаючы лепшаму росту і развіцьцю расьлін. Такія каштоўныя ўласьцівасьці гною прымушаюць зьвярнуць асаблівую ўвагу на збор магчыма большай колькасьці гною ў гаспадарках і такой якасьці, каб усе яго каштоўныя ўласьцівасьці пры ўнясеньні ў глебу, маглі выявіцца з найбольшай сілай.

**Мы лічым неабходным завастрыць на гэтым пытаньні ўвагу як нашых саўгасаў і калгасаў,** так і масы паасобных гаспадароў, затым што зараз з пераходам нашай жывёлы на стойлівае ўтрыманьне, пачынаецца пэрыяд накапленьня гною ў гаспадарках для выкарыстаньня яго ў будучым годзе.

Павялічыць колькасьць гною магчыма павялічэньнем падсьцілу для скаціны, якога ў нас звычайна не хапае. Таму кожны гаспадар павінен загатовіць на зіму больш подсьцілу (салома, лісьце з дрэў, мох, торф і нават пілавіньне).

Забясьпечыўшы скаціну подсьцілам, трэба ўмець захаваць атрыманы гной так, каб ён ня страціў самыя галоўныя спажыўныя рэчы. Але ў нас з захаваньнем гною якраз справа дрэнная.

Гной увесь час ляжыць пад скацінай, дзе з яго выцякаюць жыдкія часткі і выносяцца вон, ці яшчэ горш, гной выкідваецца з хлява і ляжыць у кучах, дзе яго сушыць сонца і праветрывае вецер, а сьнег і дождж вымываюць такую кучу да дна.

Ручаі сьнегавой і дажджовай вады штогод уносяць з двара наша багацьце—гнойную жыжку, а разам з ёй самыя каштоўныя і спажыўныя рэчы. У выніку такога хаваньня мы атрымліваем зьнясілены гной, які на справе—прамыты і высушаны подсьціл, з якога мы атрымліваем мала гною, так як у гэтких выпадках гной хутка перагарае.

З адной з паловаю тоны сьвежага гною застаецца перапрэўшага ня больш 1 тоны, а праз год хаваньня можа застацца толькі паўтоны перагною. Пры такім перагараньні гною значная частка каштоўных спажыўных рэчаў азоту выпіраецца ў паветра.

Такім чынам другая асноўная задача—гэта добра захаваць гной да вывазу на поле.

**Перад саўгасамі і калгасамі трэба паставіць абавязковую задачу—пабудову хавальні гною.**

Гэта—неабходная прыналежнасьць кожнай хоць-бы мала культурнай гаспадаркі. Пры захаваньні гною ў сялянскіх гаспадарках звычайна ў хлявох пад скацінай, неабходна з восені добра ўтрамбаваць глінай падлогу, каб яна зусім не прапускала гнойную жыжку з двара. Акрамя таго, зімою трэба падкладваць пабольш подсьцілу, каб уся жыжка добра ўсочвалася і каб скаціна ўтрымлівалася па магчымасьці ў чыстаце. Зусім нельга захоўваць гной на двары ў кучах.

Калі гной выносяць з-пад скаціны, дык хавальню яго трэба зрабіць побач пад сьцяной хлява. Лепей за ўсё рабіць яе ў выглядзе няглыбокай, у тры чвэрткі мэтра, ямы. З бакоў яма прысыпаецца зямлёй так, каб у яе не зацякала дажджавая і сьнегавая вада, сьценкі і дно такой ямы павінны быць добра ўтрамбаваны глінай, каб не прапускаць жыжкі. Дно робіцца са скатам у адзін бок, дзе робіцца невялікі калодзеж для збору жыжкі.

Гной раўнамерна раскідваецца па гэткай яме і шчыльна ўтаптваецца. Пры такім захаваньні гною, хоць частка спажыўных рэчаў і губляецца, але ўсё-ж менш, чым гэта бывае пры звычайным хаваньні гною ў кучах.

Такім чынам, зараз-жа яшчэ да пачатку зімы неабходна падрыхтаваць месца для хаваньня гною і загатовіць больш подсьцілу для скаціны.

Накопім за зіму больш гною і, правільна захоўваючы яго, дамо гной лепшай якасьці нашым палеткам. Гэтым самым мы забясьпечым падвышэньне ўраджайнасьці хутчэй, чым якімі іншымі мерапрыемствамі.

**Агроном Г. Кандрацьцеў.**

# ХТО НАСТУПНЫ?

## Трактар імя „Бел. Раб. і Сялянкі“ ў падарунак калгасу.

### Мы выпісваем 45.

Мы падпісаліся на 45 экзэмпляраў часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“, а таксама сабралі на самалёт „Беларуская Работніца і Сялянка“ 10 р. 60 к. Заклікаем усіх жанчын нашага сельсавету і раёну пасьледваць нашаму прыкладу.

*(Подпіс).*

Вёска Цітоўка, Магілеўскай акр.

**Ад рэдакцыі. Часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“ зьбірае зараз сродкі не на самалёт, а на трактар у падарунак калгасу, для якой мэты заклікае чытачак арганізаваць зборы.**

**Віцебская канфэрэнцыя чытачак і рабкорак далучылася да пастановы чытачак Менску аб пабудове трактару.**

1114
1904 г.

# Беражы здароўе

## Можна і трэба забэрагчыся.

Адзёр (корь)—вельмі распаўсюджаная хвароба. Калі хворы кашляе, чыхае, плюе, ён раскідае наўкола драбнюткія кроплі, якія пасьля разам з паветрай трапляюць да акаляючых, заражаюць іх. Найбольш распаўсюджана хвароба сярод дзяцей. Здароваму дзіцяці досыць кароткі час пабыць каля хворага, як само яно захварэе.

Такая распаўсюджанасьць адру сярод дзяцей стварае вельмі няправільную, памылковую думку, нібы адзёр „абавязковае захворваньне“.

Хвароба пачынаецца насмаркам, кашлем, сьлёзацячэньнем, хворага трасе. Праз 3—5 дзён паяўляецца высыпка, перш на твары, пасьля,—за адзін два дні,—высыпка пакрывае ўсё цела. Разам з гэтым яшчэ больш запаляюцца сьлізістыя абалонкі, дыхацельных шляхоў, вачэй, нават кішэчніка. Хвораму цяжка глядзець на сьвет. Адсюль памылковая думка: „адзёр баіцца сьвету“, таму памылкова робяць, калі завешваюць вокны пакою хворага, да цемнаты. Сапраўды-ж дастаткова завесіць вокны паперай, тонкай тканінай, каб толькі прытупіць яркі сьвет. Сьвятло як і паветра ня шкодны, а карысны хвораму.

Адровая высыпка праз 2—3 дні зьнікае. Тэмпэратура зьніжаецца, калі няма ускладненьняў, дзіця выздараўлівае ў бліжэйшы час.

Але не заўсёды адзёр праходзіць гладка. Ускладненьні: як запаленьне лёгкіх, вушэй—часта зацягваюць хваробу і нават вядуць к сьмерці. Адзёр не такая лёгкая хвараба, як гэта думаюць многія. Ад адру дзіця слабее, робіцца схільным к захворваньню сухотамі. Чым меншае дзіця, тым небясьпечней для яго адзёр. Дзецi да году, рахітычныя, фізычна слаба разьвітыя, схільныя к прастудзе,—часьцяком робяцца ахвярай эпідэміі адру.

Вялізарную памылку, нават злачынства, робяць маткі, якія сьвядома трымаюць здаровых дзяцей каля хворых адром, для таго, каб „пазбавіцца ад абавязковай хваробы“. Такая матка ўзнагароджвае дзіця хваробай, за якую часьцяком дзіця плаціць жыцьцём.

Трэба цьвёрда памятаць: захворваньне адром не абавязковае, ад яго можна ўберагчыся, як і ад іншай хваробы.

Пры захворваньні аднаго дзіцяці трэба безадкладна ізаляваць ад яго астатніх дзяцей, найлепш перанесьці іх у іншую кватэру.

Узбудзіцель адру кволы, ён лёгка гіне пад уплывам сьвету, паветру. Таму дастаткова ў памяшканьні, дзе быў хворы адром, расчыніць вокны, праветрываць такім чынам пакой 1-2 сутак,—адровая зараза будзе зьнішчана.

За апошнія 5 год вялікі пасьпех атрымала папярэджваючая ад хваробы сываратка. Яна робіцца ў бактэрыолёгічным інстытуце з крыві выздаравеўшых дзяцей ці хварэўшых некалі адром дарослых. Назіраньні паказалі, што дзеці, атрымаўшыя сываратку ад выздараўліваючых, не хварэюць адром зусім, атрымаўшыя сываратку ад бацькоў ці дарослых—не захворваюць у 50 проц. (палова). Нават, калі такое дзіця і захварэе адром, то хворасьць праходзіць вельмі лёгка.

Дзеці, захварэўшыя адром, не павінны наведваць школу на працягу трох тыдняў. Дзеці, у сям'і якіх ёсьць хворыя, не наведваюць школу 2 тыдні пасьля ізаляцыі.

Доктар **Нейфах**.


## „Беларуская Работніца і Сялянка“

**3 студзеня 1930 году будзе выходзіць 3 разы ў месяц.**

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі ці прысылаць непасрэдна ў рэдакцыю.

Часопіс каштуе— у месяц: . . . . 20 капеек | Паўгода. . . 1 р. 20 капеек
3 месяцы . . . 60 „ | Год . . . . 2 р. 40 „

**Цана асобнага нумару 10 кап.**

Падпішчыкі здаўшыя грошы раней адтрымліваюць часопіс без даплаты.

**Упаўнаважаныя па падпісцы атрымоўваюць 10 проц. з сабранай сумы.**

**Кожная актывістка, грамадчыца, дэлегатка, работніца, калгасьніца, саўгасьніца, бяднячка і серадняччка—павінна чытаць сваю часопіс „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА“.**

**Кожная актывістка павінна распаўсюджваць гэту часопіс.**

Чытайце, распаўсюджвайце і пішэце ў сваю часопіс.

*Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Карла Маркса, 14, тэлефон—2-43.*

ГПБ Ср. Аз.



*Выдавец*—**Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б.** *Рэдактары:* **С. Крэмер. Г. Рагазіньнікава.**

Друкарня БДВ. Заказ № 760. У ліку 16.000 экз. Галоўлітбел № 748.

B000000226 1576